Мэта работы – вывучэнне практыкі лячэння “*ляку*” ў знахарскай практыцы Беларускага Палесся ў XX – пачатку XXI ст. Крыніцамі для напісання работы паслужылі матэрыялы палявых этнаграфічных даследаванняў канца XIX – пачатку XXI ст., а таксама працы этнографаў і фалькларыстаў дадзенага перыяду.

Традыцыйна “*ляк*” з’яўляецца адной з самых распаўсюджаных хвароб у знахаскай практыцы Беларускага Палесся. Як бачна з яе назвы, асноўнай прычынай “*ляку*” традыцыйна лічылі моцны псіхалагічны стрэс у выніку знешняга ўздзеяння (звычайна нечаканага), якое, аднак, адрознівалася ад іншых падобных хвароб, паколькі апошнія мелі характар звышнатуральнага (матанакірааванага (“*зробленае*”) ці выпадковага (“*урокі*”, “*прыстрэк*”) магічнага ўздзеяння). Матэрыялы пачатку XX ст. прыводзяць такія назвы гэтай хваробы, як “*перапуг*” (Рэчыцкі павет) [1, с. 387], “*пуд*” (в. Дарашэвічы Петрыкаўскага раёна) [2, с. 164 (№ 12)], “*пярэпалах*”: “*Ест такія бабы, каторыя добра ўмеюць качаць перапалах*” (в. Колкі Клецкага раёна) [3, с. 187 (№ 1673)]. Матэрыялы сярэдзіны – другой паловы XX ст. акрамя вышэйзгаданых, прыводзяць і іншыя назвы, якія ў ранейшых крыніцах не былі зафіксаваны: “*зляк*” (в. Новакузнечная Лоеўскага раёнаў) [4, с. 122 (176)], “*ляк*” (в. Верхнія Жары Брагінскага) [4, с. 122 (№ 177)] і як яго варыянт “*ляг*” (в. Жахавічы Мазырскага раёна), “*жах*” (в. Сіманічы Лельчыцкага раёна). Акрамя гэтага, у матэрыялах гэтага часу пачынае фіксавацца слова “*іспуг*” (“*спуг*”) (в. Залатуха Калінкавіцкага раёнаў) [4, с. 121 (№ 175)].

Вынікі сучасных палявых этнаграфічных даследаванняў падцвярджаюць і дапаўняюць гэтую інфармацыю. Назіраецца пэўная рэгіянальная лакалізацыя вышэйпрыведзеных назваў. Так, найбольш пашыраным словам, для абазначэння “*ляку*” ў Беларускім Палессі з’яўляецца ўласна слова “*ляк*”: “*А шчэ я шапчу дзецям як спужаюцца ляк*” (Маркоўская Марыя Пракопаўна, 1920 г.н., в. Маркоўскае Лельчыцкага раёна). Пры гэтым ва ўсходняй частцы рэгіёна (Брагінскі, Лоеўскі, Нараўлянскі, Хойніцкі раёны) для абазначэння дадзенай хваробы пашырана слова “*зляк*”: “*Ну, зляк, дзіця ўжо не спіць, дзёргаецца, вочы не закрывае, павядзеш і к бабе, а яна кажа, што спугаўся*” (Скачок Кацярына Антонаўна, 1935 г.н., в. Губічы Буда-Кашалёўскага раёна. Да 1986 г. пражывала ў в. Міхалёўка Брагінскага раёна). У цэнтральнай частцы Беларускага Палесся таксама распаўсюджаны такія словы, як “*пуд*”, “*жах*”. Пры гэтым дадзенае размеркаванне не з’яўляецца абсалютным. Напрыклад, слова “*зляк*” было зафіксавана аўтарам у в. Моталь Іванаўскага раёна. Самі інфарманты часта ведаюць некалькі адпаведнікаў і свабодна карыстаюцца імі ў размове: “*Жах бувае, ляк называецца, ляк*” (Астаповіч Анастасія Уладзіміраўна, 1931 г.н., в. Дуброва Лельчыцкага раёна). Асобнае месца ў абазначэнні “*ляка*” займае слова “*спуг*” (“*іспуг*”). Гэтае слова не фіксуецца ў крыніцах пачатку XX ст. і вельмі мала сустракаецца ў запісах пазнейшага перыяду. Аднак у тэкстах канца XX – пачатку XXI ст. яно з’яўляецца адным з самых пашыраных абазначэнняў “*ляку*”. Гэтыя факты, верагодна, сведчаць аб запазычванні гэтага слова з рускай мовы ў выніку культурных працэсаў XX ст. Падцверджаннем гэтага з’яўляецца, напрыклад, тое, што ў замовах ад “*ляку*” слова “*спуг*” сустракаецца вельмі рэдка. Некаторыя інфарманты прама кажуць аб нехарактэрнасці гэтага слова для мясцовай традыцыі: “*Гаворыцца іспуг, ляк, по нашэму это лякы називаюцца*” (Цярлецкая Валянціна Антонаўна, 1930 г.н., в. Дубое Пінскага раёна).

Як ужо адзначалася вышэй, прычынай “*ляку*” ў народнай традыцыі лічыцца моцнае нечаканае псіхалагічнае ўздзеянне на чалавека. Як адзначае інфармант А. К. Сержпутоўскага: “*Пярэпалах вельмі ліхая хвароба. Яна робіцца з таго, як хто-небудзь спужае. Пярэпалах робіцца раптоўна. От быў здароў, а як спалохаецца, дак адразу й захварэе да так баццэ ўжэ пракачаўса тыдзень ці больш*” [3, с. 224 (№ 2019)]. Сучасныя інфармнты падцярджаюць гэтыя словы: “А ад чаго ляк бывае? – *Од чого? Од чого хочэш злякаецца. Злякаюцца воны ўжэ*” (Кульбеда Ганна Несцераўна, 1923 г.н., в. Моталь Іванаўскага раёна). Сярод сімптомаў “*ляку*” называюцца калачэнне, адсутнасць апетыту, апатыя, у маленькіх дзяцей наадварот – капрызнасць і пастаянны

плач: “*Пярэпалахі бываюьц ат людзей, жыўёла ці абы ат чаго. Хваробу гэтую лёгко пазнаць, бо ў ёй дзіця дражыць, нічого не бярэ ў рот і доўго крычыць і крычыць*” [3, с. 188–189 (1689)]; ці: “*Ну вот як, еслі ён не спіць, і прыходзіць, вот трасе яго, і ён есць не хоча вот, ён знае, шо ён злякаўсь.* […] *Прыводзяць яго ка мне, і вот ён сядзіць, і вот на ём і зубы калоццяцца, і рукі калоцяцца, і ўсе калоціцца, вот ізляк*” (Краўчанка Тамара Ніканораўна, 1937 г.н., в. Чамярысы Брагінскага раёна). Пры гэтым адзначаецца, што “*ляк*” з’яўляецца вельмі небяспечнай хваробай, паколькі, калі яго не лячыць, ён можа што называецца “*ўдаўніцца*” – перайсці ў хранічную стадыю і паспрыяць з’яўленню іншых захворванняў: “*Із-пад спугу любая балезнь падкідаецца, дажэ сахарны дзіябет із-пад спугу падкідаецца*” (Уласенка Наталля Рыгораўна, 1944 г.н., в. Чамярысы Брагінскага раёна); ці: “*Вот это ж спуг. Это болезць сама цяжэлейша, од іспугу. Вона і нервы, вона і на вум вліяе, вона і ногы, вона й на глаза, куды хочэш, і ў сэрэдыне ўсэ вона. І заболееш і на лёгкыі, і на ўсё заболееш, на пэчэнь заболееш. А ўрачы ее не прызнаюць: “Здороў, ты здороў. Чо ты прыдурываешся? Ідзі работай”. А він нэ можэць ходыты*” (Кузьміч Фядора Мартынаўна, 1923 г.н., в. Баландзічы Іванаўскага раёна), і нават стаць прычынай смерці: “*Ты знаеш шо ў нас от спуга дзеўка, ета, маладая, ішла ўвечары на вечоркі гуляць і сабака сарваўся, прыбег яе спужаў, бег за яю, укусіў яе, іззадзі за юбку ўхапіў да парваў. І яна спужалася, ў яе нага забалела, забалела, яна скора ўмерла.* – Ад спуга? – *Ад спуга, да, это сама горша хвароба, спуг*” (Юшкевіч Марыя Андрэеўна, 1927 г.н., в. Сярэднія Печы Лельчыцкага раёна). Традыцыйна лічылі, што на “*ляк*” у большасці хварэюць дзеці: “*Яшчэ часто дзеці хварэюць з пуду ці пярэпалаху*” [3, с. 188 (№ 1689)], аднак часта з гэтай хваробай да знахароў звярталіся і дарослыя: “*А вот і едуць этые хлопцы, каторые в это во, да бывае ж па дарозе йідуць, да нэ дай Бог аварыя. Дык, от одын казав, выйшла якась жэншчына, ну, якась бэзумная, вылезла на дарогу, а він жэ на ее не наехав нішчо, але казав думав вона впала, а він думав, шо він еі пэрэйіхав, так він ужэ без памяці это. То вы знаэтэ, шо він став быто мэшацца ўжэ. Вот это ж спуг*” (Кузьміч Фядора Мартынаўна, 1923 г.н., в. Баландзічы Іванаўскага раёна). Пры гэтым адзначаецца, што “*ляк*” (у адрозненні, напрыклад, ад “*урокаў*”, “*прыстрэку*”) з’яўляецца толькі чалавечай хваробай: “*Не, коровам лякі не, корова мо не лякаецца*” (Амянчук Аляксандра Паўлаўна, 1935 г.н., в. Моладава Іванаўскага раёна. Нарадзілася ў в. Гаравата Іванаўскага раёна).

Адпаведна, дыягностыка “*ляку*” грунтавалася на вышэйпералічаных сімптомах, якія дапаўняліся аповедамі пацыентаў: “*То дэтына*

злякаецца, то й сам злякаецца дэ хто, да прыйдэ: "баба, я нэ можу спаты, мэнэ"... Да я ёй поговору той ляк, шо вона злякаецца. Да вона і... Гэто нэ вэльмі даўно прыходзіла няка да кажэ: "Гэтак шось зробілось, шо нэ можно спаты, нэ можно й ходыты і просто больная". А я помолылася да той ляк. Да кажу: "Як ты, тобе ліпшай ужэ"? – "Добрэ ўжэ стало". Добрэ. Абы помогло" (Кульбеда Ганна Несцераўна, 1923 г.н., в. Моталь Іванаўскага раёна). Але часта сімптомы хворага не дазваляюць паставіць дакладны дыягназпа прычыне існавання ў знахарстве ўяўленняў аб вельмі блізкіх па паходжанню хваробах ("*урокі*", "*паддзіў*", "*прыстрэк*"), якія па сімптаматыцы нагадваюць "*ляк*". У выпадку сумненняў пры пастаноўцы дыягназу распаўсюджана практыка пераказвання вядомых "*шаптухам*" замоў, пакуль "*знаючы*" (у больш рэдкіх выпадках пацыент) не пачынае моцна пазяхаць, што лічыцца знакам таго, што менавіта гэтую хваробу і трэба лячыць: "*А воно зразу, як ты, як ты етого, ў його як вон ляк, чы ўрокі, так ты молышса, молышса і домолышса, от ужэ ляк, і ты так, і тэбе так позяхі бэруць, ты позяхаіш*" (Амянчук Аляксандра Паўлаўна, 1935 г.н., в. Моладава Іванаўскага раёна. Нарадзілася ў в. Гаравата Іванаўскага раёна). Акрамя гэтага, прычына хваробы, яе крыніца і ступень цяжкасці ўдакладняюцца непасрэдна падчас лячэння.

Што тычыцца ўласна спосабаў лячэння "*ляку*", то можна адзначыць значную колькасць вядомых спосабаў лячэння гэтай хваробы, якія існавалі ў рэгіёне. Пры гэтым найбольш распаўсюджаным з'яўлялася "*выкачванне*" ляку з дапамогай яйка ці хлеба. Яшчэ А. К. Сержпутоўскі ў пачатку XX ст. прыводзіць прыклад "*выкачвання*" "*ляку*" з дапамогай хлеба і падкурванне хворага поўсцю жывёлы якая яго спужала (калі тая лічылася крыніцай хваробы): "*Пакуль не ведаюць, з чаго стаў перапалах, та перш усяго яго качаюць, дзеля чаго па жывату хворага качаюць мякішам хлеба, покуль скачаюць галку. Тую галку даюць сабацы. Як той сабака зьесць той хлеб, та дзіцяці будзе лягчэй*" [3, с. 189 (№ 1689)]. У аповядах інфармантаў прыводзяцца і даволі нетыповыя спосабы лячэння, калі хворым займаліся адразу некалькі "*знаючых*", якія выкарыстоўвалі розныя спосабы: "*У мяне брат пас кароў. Дык сеў на пень, а вуж ды ў рубашку яму. Ён спужаўся, пабег. Дык другі пастух паймаў яго. Як прыйшоў дадому, ды як забалеў. Банкамі лячылі, ці што гэта такое. У бальніцу завозім. У бальніцы прызналі востры туберкулёз. Забралі з бальніцы, прывезлі яго. Ён ужо ніякі, у яго пальчыкі паўцягаліся. Прыйходзіць той хлопчык і кажа: "Дзядзя Павел, знаеце што, ваш Іван спужаўся, ета ён вужа", ды давай расказваць як. Дык мы тады скарэй, дзед запрог*

коней і ў Міхалёўку, да дзеда таго Палітавіча. Дык дзед еты і баба яго лячылі. Дык дзед павёў на зоры лячыў, а баба на хлеб на печы лячыла. Вот і к зорам лячыў, увечары. Яны ж знаюць на якія зоры. Знаеце што, не еў ён нічога. Дык туды вялі яго пад ручкі, а назад сам ішоў. Дык дзед сказаў, што колькі ён будзе спаць, столькі хай спіць, не будзіце яго. І прыехаў дадому: "Мама, есць." Дык мамка яму патроху. Дык ачуняў патроху і ў армяю яшчэ пайшоў" (Скачок Лідзія Якаўлеўна, 1926 г.н., в. Губічы Буда-Кашалёўскага раёна. Да 1986 г. пражывала ў в. Крукі Брагінскага раёна).

У канцы XX – пачатку XXI ст. працягваюць існаваць такія спосабы, як выкачванне "*ляка*" з дапамомогай хлеба ці яйка. Напрыклад, Міранчук Аляксандра Дзмітрыеўна (1928 г.н., в. Жмурнае Лельчыцкага раёна) можа выкачваць «ляк» і хлебам, і яйкам: "*Выкачваю і хлебом. І яйцом вікачваю. Яечком выкачваю, шапчу і вікачваю, а потом яечко над головою ўжэ трэці раз по…, покачаю, да воды набіраю ў стакан, да туды яечко б'ю, да там ужэ покажэ зразу, ці спуг йе, ці е ляк ці німа, на водзе*". Пры гэтым таму, ці будуць часткі яйка, ўлітага ў шклянку з вадою, цягнуцца да паверхні (так званыя "*галовы*"), вызначаюць ці хворы чалавек (калі так, цягнуцца, то хворы), і па іх колькасці вызначаюць ступень хваробы: "*Вот у тэбэ іспуг тожэ есця. Вот эта выліць трэба. А еслі нэ дай Бог, чы аварыя, чы, сільно прыпугаўса, так повэн стакан аж… Так кіпіло, порвало б стакан*" (Кузьміч Фядора Мартынаўна, 1923 г.н., в. Баландзічы Іванаўскага раёна). Некаторыя інфарманты па форме "*галоў*" вызначаюць і мяркуемую прычыну хваробы: "*А на яйцо, вот вукачаю яйцом сырым, яйцом, і на воду вуллю. І яно тамака стаіць дак ійе такое во, ці мужчына, ці ад трактара, ці ад сабакі, ад сабакі будзе кашлатае такое вада, ну вот такое нізкае. А ак чалавек, дак так вот, стоўбікамі*" (Садчанка Ганна Еўстраф'еўна, 1926 г.н., в. Губічы Буда-Кашалёўскага раёна. Да 1984 г. пражывала ў г. Хойнікі Хойніцкага раёна).

Пры гэтым назіраецца тэндэнцыя знікнення часткі спосабаў лячэння (напрыклад, "*выліванне*"), а таксама спрашчэння працэдуры лячэння, калі акцыянальна-прадметны бок працэсу лячэння паступова знікае, пры захаванні і дамінаванні вербальнага кампанента (замовы і малітвы). Напрыклад, частка інфармантаў адзначала, што яны выкарыстоўваюць не поўную працэдуру лячэння, вылючыўшы з яе пэўныя элементы: "*Я й хлебом не… Каталі і хлебом колісь, катала баба Марына*" (Хвацік Ніна Іллінішна, 1926 г.н., в. Сіманічы Лельчыцкага раёна); ці: "*Раньшэй укачывалі яйцом. А я так, пошапчу, дай і помогае*" (Міненка Дар'я Марцьянаўна, 1914 г.н., г.п. Лельчыцы

Лельчыцкага раёна). Аднак да нашага часу ступень захаванасці комплексу спосабаў лячэння “*ляку*” з’яўляецца досыць высокай у параўнанні з большасцю астатніх хвароб. Акрамя таго, паколькі сёння пацыенты часта жывуць далёка ад месца пражывання знахароў, распаўсюджванне атрымалі дыстанцыйныя спосабы лячэння “*ляку*”, калі “*знаючы*” пераказвае неабходную замову на ваду, якую затым перадаюць хвораму.

Такім чынам, лячэнне “*ляку*” ў знахарскай практыцы Беларускага Палесся дэманструе значную ступень захаванасці ў параўнанні з матэрыяламі першай трэці XX ст. Пры гэтым назіраецца з’яўленне новых назваў хваробы (“*спуг*”), скарачэнне спосабаў лячэння “*ляку*”, якія існуюць у знахарскай практыцы ў канцы XX – пачатку XXI ст., і спрашчэнне тых з іх, што захаваліся. Таксама, ў сувязі з немагчымасцю прамога кантакта знахара з часткай пацыентаў у знахарскай практыцы Беларускага Палесся ўзрастае роля безкантактных спосабаў лячэння.

Крыніцы і літаратура

1 Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Часлаў Пяткевіч ; уклад., прадм. У. Васілевіча ; пер. з пол. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2004. – 670 с. – (Беларускі кнігазбор: БК, Серыя 1, Мастацкая літаратура. Серыя 2, Гісторыка-літаратурныя помнікі).

2 Moszyński, K. Polesie wschodnie: Materjały etnograficzne z wschodniej części b. powiatu Mozyrskiego oraz z powiatu Rzeczyckiego / K. Moszyński. – Warszawa : Wyd-wo Kasy im. Mianowskiego, 1928. – 304 s.

3 Сержпутоўскі, А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі ; навук. рэд. А. С. Фядосік ; прадм. У. К. Касько]. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

4 Полесские заговоры: в записях 1970–1990-х гг. : сб. / Рос. акад. наук, Ин-т славяноведения. – М.: Индрик, 2003. – 751 с.

Uladzimir Hanchar. **Treatment of fright in the healing practice of Belarusian Polesie in 20- beginning 21 century**. *In the article is considered the curing of “fear” – the illness, which allegedly appears as the result of someone was frightened – in witch-doctors’ practice in Belarusian Polesie in the XXth - the beginning of the XXIst century. The variability of illness names, its symptoms, means of its diagnosing and curing are investigated, and evolution of means of “fear” curing in the period under review are traced. Author comes to conclusion about considerable stability of “fear” curing complex in witch-doctors' practice of the region. Meanwhile, he notes the tendency to shortening and simplifying of “fear” curing means, and to growing of significance of contactless ways of its curing.*

УДК 327(438:47+57)]”1991/2015”

К. М. Лайкоў

Інстытут гісторыі НАН Беларусі
Цэнтр гісторыі геапалітыкі

ВЫШАГРАДСКАЯ ГРУПА І РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ: ЭТАПЫ СТАНАЎЛЕННЯ ЎЗАЕМААДНОСІН І ПЕРСПЕКТЫВЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА

У работе аналізуецца працэс станаўлення ўзаемаадносін паміж Рэспублікай Беларусь і Вышаградскай групай у палітычнай, эканамічнай і культурных сферах. Вызначаны далейшыя перспектывы развіцця адносін паміж німі. Даследуюцца асаблівасці знешняй палітыкі, робяцца спробы перыядызацыі вызначаннай навуковай праблемы.

15 лютага 2016 года ў г. Празе (Чэшская Рэспубліка) адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 25-гадоваму юбілею рэгіянальнай супольнасці Чэхіі, Польшчы, Венгрыі і Славакіі [8]. У сусветнай практыцы саюз дадзеных дзяржаў прынята называць як Вышаградская група (В4).

На сённяшні дзень яна ўяўляе сабой, бадай, найбольш вядомае і стабільнае рэгіянальнае аб’яднанне, якое ўзнікла пасля распаду сацыялістычнага блока ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе.

На працягу 1990-х гг. і ў першае пяцігоддзе XXI стагоддзя асноўныя знешнепалітычныя намаганні В4 былі накіраваны на ўваходжанне ў Еўрапейскі саюз і НАТА. І хоць у рамках гэтых арганізацый самастойныя знешнепалітычныя ініцыятывы краін-удзельніц аб’яднання былі істотна абмежаваныя неабходнасцю узгадненняў сваіх крокаў з афіцыйным Бруселем, тым не менш, яны праводзілі дастаткова актыўную палітыку суседства па ўсім сваім перыметры.

Так, атрымалі сваё развіццё кантакты і сувязі як з Германіяй і Аўстрыяй, так і з стварыўшымі сваю дзяржаўнасць былымі рэспублікамі СССР, уключанымі пазней у палітыку Ўсходняга партнёрства ЕС: Украінай, Грузіяй, Малдовай, Арменіяй, Азербайджанам і надалей Рэспубліка Беларусь.

Цяпер Вышаградская чацвёрка досыць актыўна выступае на шматлікіх пляцоўках, асабліва ў НАТА і ЕС, працягвае пры дапамозе Вышаградскага фонду ажыццяўляць т.зв. «палітыку мяккай сілы» па суседстве ў накірунку былога СССР і Балкан, фінансуючы шэраг адукацыйных праектаў, праграм падтрымкі грамадзянскіх супольнасцяў і сродкаў масавай інфармацыі ў гэтых краінах [7].

У рамках гэтай работы будзе праведзены кароткі аналіз асноўных этапаў станаўлення ўзаемаадносін паміж Рэспублікай Беларусь і Вышаградскай групай у палітычнай, эканамічнай і культурных сферах, а таксама вызначаны далейшыя перспектывы развіцця іх адносін.

У той жа час варта адзначыць, што за перыяд свайго існавання саюз дзяржаў цэнтральна-еўрапейскага рэгіёну так і не інстытуалізаваўся. Да гэтага часу не сфарміраваны апарат альбо цэнтральны сакратарыят. Адзінай створанай у рамках саюза структурай з’яўляецца Вышаградскі фонд. Узгадненне планаў узаемадзеяння на год у аб’яднанні ажыццяўляецца па чарзе Венгрыяй, Польшчай, Славакіяй і Чэхіяй, якія змяняюць адзін аднаго ў канцы чэрвеня кожнага года [11]. Часткова ў планах старшынствуючых краін няма галоўнага – пераемнасці.

За сваю гісторыю палітычныя двухбаковыя ўзаемаадносіны паміж краінамі Вышаградскай групай і Рэспублікай Беларусь прайшлі пэўныя стадыі развіцця.

Так, першым этапам актыўнасці можна лічыць 1990-я гг. Пасля атрымання незалежнасці Беларусь устанавіла дыпламатычныя адносіны з Польшчай (1992), Венгрыя (1992 г.), Чэхіяй (1993 г.) і Славакіяй (1993 г.), якія раней падпісалі дэкларацыю аб стварэнні рэгіянальнага аб’яднання [3].

Адносна беларускага падыходу да Вышаградскай саюзу сведчыць дакумент «Асноўныя напрамкі знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь», распрацаванай у беларускім МЗС ў 1994 г., дзе гаварылася пра тое, што дзяржава будуе шматузроўневую сістэму прыярытэтаў і двухбаковых адносін. Вядучым элементам беларускай знешнепалітычнай стратэгіі на гэты перыяд называліся адносіны з Расійскай Федэрацыяй, затым раўназначна прыярытэтнымі прызнаваліся тры азімута: Украіна, Польшча і дзяржавы Прыбалтыкі. На еўрапейскім кірунку вылучаўся ўзровень – Германія, Венгрыя, Чэхія, Славакія, Балгарыя, Румынія [6, с. 33].

У гэты ж час перад Вышаградскай саюзам як аб'яднаннем таксама не стаяла мэты развіцця адносінаў з асобнымі дзяржавамі і гэта тлумачыцца, перш за ўсё задачамі, выпрацаванымі першымі дэкларатыўнымі дакументамі, і крызісам самой структуры.

Другі этап прыйшоўся на пачатак 2000-х гг. і быў звязаны з першымі крокамі «чацвёркі» у якасці членаў Еўрасаюза. Гэтыя гады былі адзначаны імкненнем дамагчыся раўнапраўя з астатнімі краінамі ЕС, скарэктаваць сваё становішча ў рамках саюза, адыграць магчымасці, упушчаныя пры перамовах аб уступленні.

Менавіта з гэтага моманту «беларускі накірунак» пачынае больш выразна фігураваць у афіцыйных дакументах В4, перш за ўсё, падчас

абмеркавання Еўрапейскай палітыкі суседства. Пачынаючы з чэшскага старшынства ў групе (2003–2004 гг.) пытанні палітычнага ўзаемадзеяння з Беларуссю разглядаліся вельмі вузка і толькі ў рамках міжведамасных кансультацый без прыцягнення беларускага боку. Асноўнымі тэмамі сталі перадача вопыту сацыяльнай трансфармацыі грамадства і пабудова рынкавых асноў эканомікі.

Акрамя гэтага, на ўзроўні ЕС Вышаградскай чацвёркай былі падтрыманы крокі на шэраг абмежаванняў для Беларусі. Намаганні дыпламатыі аб'яднання былі накіраваны на «развіццё свабоды і дэмакратыі».

У той жа час, можна адзначыць і станоўчыя моманты, штогод з пачатку 2006 г. ў афіцыйных дэкларацыях, апублікаваных па выніках сустрэч вышэйшых службовых асоб В4, падкрэсліваліся намаганні ў пытаннях паслаблення візавых абмежаванняў ЕС для шэрагу беларускіх грамадзян (студэнты, навукоўцы і выкладчыкі) [9]. У 2008 г., да прыкладу, было прапанавана прасоўваць ідэю памяншэння візавых збораў для грамадзян і вызваленне ад выплаты візавых збораў для моладзі [12].

Беларуская знешнепалітычная актыўнасць не была накіраваная на групу як адзінае цэлае, прыярытэт быў аддадзены на выбудоўванне прагматычных, канструктыўных і добрасуседскіх адносін толькі з асобнымі ўдзельнікамі.

Трэці этап актыўнасці Вышаградскай групы пачаўся з прыняццем праграмы ЕС «Усходняе партнёрства» ў 2009 г. У сувязі з гэтым у краін В4 з'явіўся агульны інтарэс, здольны іх рэальна зблізіць, надаць асэнсаванасць іх ўзаемадзеянню.

Беларускі бок таксама спачатку з энтузіязмам успрынял Усходняе партнёрства. Аднак, на супрацоўніцтва ў межах «Усходняга партнёрства» сур'ёзна паўплывала агульнае пагаршэнне палітычных адносінаў Мінска і Бруселя [2].

Разам з тым, аналіз дакументаў і дэкларацый, выдадзеных у дадзены перыяд, дэманструе патэнцыял развіцця двухбаковых адносін паміж Беларуссю і «Вышеградам» у гэты перыяд не быў рэалізаваны ў поўнай меры Беларусь да апошняга часу заставалася хутчэй стрыманым назіральнікам, чым актыўным удзельнікам сустрэч як і ў рамках «Усходняга Партнёрства», так і В4.

З-за складанасцяў ў палітычнай сферы першачарговую ўвагу неабходна было сканцэнтраваць на іншых напрамках, у сувязі з гэтым супрацоўніцтва ў эканамічнай вобласці стала больш важным у двухбаковых адносінах паміж краінамі.

З 1990-х гг. вялася работа, накіраваная на развіццё вытворчай кааперацыі паміж Рэспублікай Беларусь і краінамі Вышаградскай

групы, а таксама прыцягненне замежных інвестыцый і крэдытных рэсурсаў, у тым ліку шляхам задзейнічання аддзяленняў буйных кампаній і банкаў рэгіёнаў ЦУЕ, зацікаўленых ва ўкладаннях у рэальны сектар беларускай эканоміцы.

На сёння можна сказаць, што краіны В4 ўваходзяць па аб'ёмах гандлю ў 30 ключавых партнёраў Рэспублікі Беларусі. Перавага тут, безумоўна, ў Польшчы (2014 – 2,4 млдр. даляраў). Для паляпшэння каардынацыі сфармавана шэраг міжурадавых камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве [3].

Найбольшая ўзаемадзеяння паміж Беларуссю і Вышаградскай групай наладжана ў адукацыйнай і культурнай сферах і звязана яна, перш за ўсё, з дзейнасцю Міжнароднага Вышаградскага фонду, праз які В4 прапануюць беларускай навуковай і культурнай грамадскасці сумесныя праграмы.

З 2009 г. рэалізуецца спецыяльная праграма для Беларусі. Праграма прапануе студэнтам і навукоўцам 60 семестраў навучання ў любым дзяржаўным ці прыватным універсітэце краін-удзельнікаў Вышаградскай групы (Чэхія, Славакія, Венгрыя, Польшча).

У 2011 г. таксама была запушчана спецыяльная праграма для краін «Усходняга партнёрства» (V4EaP), якая імкнецца выкарыстоўваць вопыт краін ЦУЕ ў сацыяльна-эканамічных пераўтварэннях, дэмакратызацыі і рэгіянальнага супрацоўніцтва для рэалізацыі яго ў рамках сумесных ініцыятыў, накіраваных на ўмацаванне сувязяў паміж мясцовымі органамі ўлады, універсітэтамі і асобнымі грамадзянамі [11].

З пачаткам 2016 г. існуе верагоднасць пачатку новага этапу ва ўзаемаадносінах паміж Рэспублікай Беларусь і Вышаградскай групай.

15 лютага 2016 г. Саветам Еўрапейскага саюза было прынята рашэнне аб скасаванні санкцый супраць беларускай дзяржавы і бізнес-супольнасці. Безумоўна, гэты крок пазітыўным чынам уплывае на інвестыцыйны клімат Беларусі, дазваляе на больш шырокім узроўні ўзмацніць кантакты не толькі з асобнымі краінамі ЕС, але і субрэгіянальных супольнасцямі ўнутры дадзенай структуры.

У той жа час, згодна з даследаваннямі, праведзеным колам даследчых структур В4 ў краінах групы больш за 50 % рэспандэнтаў у цэлым не задаволены цяперашнім станам спраў на ўсходнім вектары палітыкі [10]. Як мяркуецца значна зменіцца і вектар ініцыятывы «Ўсходняе Партнёрства», што адзначалася ў выступленні кіраўніка МЗС Польшчы ў пачатку 2016 г. [1].

Аднак, у большасці выпадкаў чакаць істотнага прарыву ў адносінах паміж Беларуссю і Вышаградскай групы чакаць заўчасна. Даследаванне,

якое было адзначана раней, паказвае, што ў найбліжэйшай будучыні Беларусь не ўваходзіць у лік прыярытэтаў знешняй палітыкі В4.

Разам з тым, на наш погляд, беларуская дзяржава здольна ў супрацоўніцтве і пры падтрымцы даволі моцнага рэгіянальнага гульца ў ЕС дасягнуць поспехаў па шэрагу кірунку і, перш за ўсё, у пытаннях візавых бар’ераў.

У эканамічнай сферы перспектывы супрацоўніцтва варта разглядаць шырэй. Патэнцыяльнымі напрамкамі супрацоўніцтва будуць з’яўляцца энергетыка, нафтахімія, фармацэўтыка, харчовая і сельскагаспадарчая прамысловасць, машынабудаванне, будаўніцтва.

Таксама розныя варыянты рэалізацыі рэгіянальнай палітыкі В4 прыводзяць да ўзнікнення унікальнай сітуацыі, калі партнёрамі Беларусі ўсё часцей могуць выступаць не нацыянальныя ўрады, а рэгіянальныя адміністрацыйныя, палітычныя структуры, лабісцкія групы. У многіх выпадках інтарэсы рэгёнаў менш ідэалагізаваны, чым пазіцыя нацыянальных органаў улады гэтых краін. Рэгіёны, як правіла, больш гатовыя да канструктыўнага ўзаемадзеяння з Беларусьсю, чым нацыянальныя органы ўлады і ў сувязі з гэтым значны патэнцыял крыецца ў развіцці гэтага напрамку. Тут паказальны прыклад Чэхіі, дзе ў 2015 г. ажыццёўлены 6 візітаў рэгіянальных уладаў, падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Магілёўскай вобласцю і Устэцкім краем, а таксама Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Гродзенскім аддзяленнем БелГПП і Эканамічнай палатай Среднечешскага краю [5]. Акрамя гэтага, дадзены кірунак дазволіць пастуова гарманізаваць нацыянальныя нормы і тэхнічныя стандарты з адпаведнымі крытэрыямі ЕС.

У галіне культуры і адукацыі намечаны далейшыя ключавыя напрамкі ўзаемадзеяння. Так, летам 2015 г. падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве паміж міністэрствамі краін Вышаградскай групы і міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусі, каардынуючым работу ў галіне маладзёжнай палітыкі [5]. У адпаведнасці з ім бакі будуць аказваць садзейнічанне адзін аднаму ў падрыхтоўцы прафесійных кадраў па працы з моладдзю, плануюць абменівацца вопытам працы ў сферы ўзаемадзеяння дзяржструктур і моладзевых грамадскіх аб’яднанняў, праводзіць сумесныя навуковыя даследаванні, семінары, сімпозіумы, канферэнцыі, кансультацыі па розных праблемах маладзёжнай палітыкі і адукацыі.

Такім чынам, на сёння складваецца сітуацыя, якая дасць магчымасць пачаць новы этап у двухбаковых адносінах паміж Беларуссю і Вышаградскай групай у розных сферах. Кантакты беларускай дзяржавы з кожнай з краін паасобку развіваюцца даволі інтэнсіўна:

з пачатку 2000-х гг. назіраецца стабільная тэндэнцыя да павелічэння тавараабароту і інвестыцый, растуць культурны абмен і супрацоўніцтва ў сферах турызму і адукацыі. Пры гэтым, нягледзячы на неэфектыўнасць супрацоўніцтва ў галіне палітыкі, эканоміка і адукацыя здольныя пачаць працэс значнага паляпшэння перспектыў далейшага супрацоўніцтва.

Спіс выкарыстанных крыніц і літаратуры

1 Восточное партнерство закончилось катастрофой [Электронный ресурс] / Радио Польша. – Режим доступа: http://www.radiopolsha.pl/6/137/Artykul/238603. – Дата доступа: 11.02.2016.

2 Мельницов, Д. Беларусь в Восточном партнерстве: Ожидания и реальность [Электронный ресурс] / Д. Мельницов // Belarusian Institute of Strategic Studies. – Режим доступа: http://belinstitute.eu/ru/node/1556. – Дата доступа: 14.02.2016.

3 Министерство иностранных дел Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://mfa.gov.by/. – Дата доступа: 20.02.2016.

4 Министерство образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://edu.gov.by/news-201506.– Дата доступа: 15.02.2016.

5 Посольство Республики Беларусь в Чешской Республике [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://czech.mfa.gov.– Дата доступа: 03.03.2016.

6 Шадурский, В.Г. Формирование концептуальных основ внешней политики Республики Беларусь (1991–2011) / В. Г. Шадурский // Веснік БДУ, Сер. 3. – 2011. – № 3. – С. 31–36.

7 Шишелина, Л. Н. Четверть века в центре Европы [Электронный ресурс] / Л. Н. Шишелина // Сайт «Вишеградская Европа». – Режим доступа: http://visegradeurope.ru/2016/02/13/любовь-шишелина-четверть-века-в-центр. – Дата доступа: 20.02.2016.

8 25th anniversary of foundation of the Visegrad Group [Electronic resource] / Government of the Czech Republik. – Mode of access: http://www.vlada.cz/en/media-centrum/aktualne/25th-anniversary-of-the-foundation-of-the-visegrad-group--140149/. – Date of access: 12.02.2016.

9 Declaration of the Prime Ministers of the Visegrad Countries Visegrad, Hungary, 10 October 2006 [Electronic resource]/ Visegrad Group. – Mode of access: http://www.visegradgroup.eu/official-statements/documents/declaration-of-the. – Date of access: 24.02.2016.

10 Dostal Vit, Trends of Visegrad foreign policy / Vit Dostal. – Praha: Association for international affairs (AMO), 2015. – 69 c.

11 Joint Statement of the Prime Ministers of the Visegrad Group Countries on the 25th V4 Anniversary [Electronic resource] / Visegrad Group. – Mode

of access: http://www.visegradgroup.eu/calendar/2016/joint-statement-of-the. – Date of access: 02.03.2016.

12 Joint Statement of the Ministers of Foreign Affairs of the Visegrad Group Countries, 23 April 2008, Czech Republic [Electronic resource] / Visegrad Group. – Mode of access: http://www.visegradgroup.eu/2008/joint-statement-of-the. – Date of access: 24.02.2016.

13 Joint Statement on the Enhanced Visegrad Group Activities in the Eastern Partnership V4 Prime Ministers' Summit, Bratislava, 16 June 2011 [Electronic resource]/ Visegrad Group. – Mode of access: http://www.visegradgroup.eu/ 2011/joint-statement-on-the. – Date of access: 04.03.2016.

***Kiryla Laykou.* The Visegrad Group and the Republic of Belarus: stages of relationship and prospects for cooperation**. *The paper analyzes the process of formation of relations between the Republic of Belarus and the Visegrad Group in political, economic and cultural spheres. Identified prospects for further development of relations between them. Additionally researched especially foreign policy, made attempts periodization designated scientific problem.*

УДК 94 (477) : «…/ 1917» : 329.73

О. В. Бобіна

Національний університет кораблебудування
імені адмірала Макарова

НАЦІОНАЛЬНИЙ УКРАЇНСЬКИЙ ПОЛІТИЧНИЙ РУХ: ЕТАПИ, ОСОБЛИВОСТІ, ПОЧАТКИ ДІЯЛЬНОСТІ

Національний український політичний рух має свої особливості. Ці особливості сформувались в другій половині XIX ст. Автор описує основні етапи розвитку національного політичного руху і його характеристики. Особлива увага звертається на умови в яких починали свою діяльність українські політики, організації і партії. Автор робить висновки, що український вплив був присутній у вузькому середовищі української інтелігенції.

В своїх дописах до шанованого наукового збірника ми вже звертались до історії політичного руху в Україні, вказували на його особливості і специфіку. Взагалі, історія національних культурних і політичних рухів залишається в центрі уваги науковців. [1]. Даною розвідкою ми хочемо звернути увагу білоруських колег на основні етапи і особливості національного українського політичного руху. Особлива увага звертається на початки діяльності українських політичних сил. Таке історичне знання дозволяє провести порівняльний

аналіз білоруського і українського політичного руху в їхній історичній ретроспективі і можливих взаємовпливах. Особливу цікавість викликають впливи польських і російських політичних сил на національний білоруський і український політичний рух як в XIX ст., так і пізнішої доби.

Порівнюючи політичні рухи України, Росії, Польщі, Чехії (як найбільш розвинутих політичних спільнот) слід вказати на «молодість» національного українського руху і його, загалом, невеликі впливи на суспільство. Це видно, в тому числі, і при спробі визначити основні етапи історії національних політичних сил. Ми пропонуємо визначити такі етапи історії як: 1) домодерний політичний рух (XVII – перша половина XIX стст.); 2) національний політичний рух доби модернізації (друга половина XIX ст. – 1917 р.); 3) політичний рух доби національно-демократичної революції і революції в Російській і Австро-Угорській імперії (1917–1921/23); 4) політичних рух в поділеній країні (1922/1923–1939); 5) занепад політичний сил (1940 – кінець 50-х рр.); 6) українське дисидентство 60–80-х рр.; 7) український політичний рух доби М. С. Горбачова (1985–1991); 8) Політичний рух в не залежній Україні (1991– ...).

Зауважимо, що ми зупинимось на перших двох етапах які визначили характерні риси, особливості і тенденції які стали притаманні національним політичним силам.

Домодерний політичний рух охоплює XVII – першу половину XIX ст. Він включає в себе етап самоідентифікації українців через боротьбу православних з уніатською і католицькою церквою, через козацько-селянські повстання (1596–1638) і козацько-селянську революцію (1648–1657). Вершиною політичного руху цього часу стали: 1) вимога-прохання Б. Хмельницького і української верхівки створити державу трьох народів: поляків, литовців і українців в межах Речі Посполитої, і 2) спроба створення української держави на чолі з Б. Хмельницьким. Відмовившись від цих ідей польська, магнатсько-шляхетська верхівка отримала новий кордон з Московією і українську автономію (квазідержаву) на Лівобережжі. Домодерний політичний рух охоплює часи Руїни (1658–1687) і Гетьманщини (1687–1781). Це був час контрреволюційної війни, спроби збереження власної ідентифікації, занепад власної політики, освіти, економіки, професійної «високої» культури. Кінець XVIII – початок XIX ст., – початок реформ-змін які згодом (в другій половині XIX ст.) забезпечили модернізацію української спільноти в умовах реформування Австрійської і Російської імперії. Першими відчули реформи західні українці. На відміну від підросійських земель, на українських землях що

відійшли від Польщі до Австрії почались культурно-освітні, церковні, а згодом економічні реформи. Вододілом між «старими і новими часами» в Україні стали утворення і діяльність Кирило-Мефодіївського товариства (1846–1847, Київ, підросійська Україна) і Головної руської ради (1848–1851, Львів, підавстрійська Україна). Як бачимо, хронологія, початки нового політичного руху поділеної України співпадають. Але діяльність цих організацій, і саме головне, умови, наслідки і впливи різнились. Саме тому слід звернути увагу на особливості і умови в яких розгортався політичний рух в різних частинах України.

Розвиваючись в умовах загальноросійського політичного руху та під його впливом, український рух мав свої особливості. На відміну від російського, національний рух не мав стійких історичних традицій. Це призвело до обмеженості політико-ідеологічних, організаційних основ руху. Політичний український рух не мав прошарку професійних революціонерів, які б повністю присвятили себе політичній діяльності. Відчувався брак компетентних людей для політичної діяльності, а згодом і до державницької.

Слід вказати на певну ізольованість східноукраїнського руху від західноєвропейського. Негативне ставлення російських партій до українців призвело до обмеженості ідеологічних доктрин, до механічного перенесення західноєвропейських політичних доктрин на український ґрунт. Не випадково майже півстоліття політичних рух на Наддніпрянській Україні обмежувався культурницькою програмою – започаткуванням шкіл, книгарень, бібліотек, вивченням української мови, історії, культури тощо.

Національний рух розвивався в умовах обмеженої соціальної бази. Національна соціал-демократія не могла знайти опори в національному робітництві. Цього робітництва було надто мало, воно зосереджувалося в тих галузях економіки, які не відігравали вирішального значення в політичній боротьбі − сільське господарство, харчова промисловість. Більша частина українського робітництва була поросійщена, розчинялась в масі руського, польського, єврейського робітництва, яке було домінуючим в добувній, металургійній, машинобудівній промисловості. Саме ці національності складали більшість населення промислових центрів України.

Український ліберально-консервативний рух теж не мав соціальної бази, через відсутність великого прошарку національної фінансово-промислової буржуазії. Більшість національної буржуазії зосереджувалась в сільському господарстві, переробній промисловості, дрібній торгівлі. Вирішальні галузі промисловості були

у власності франко-бельгійського, російського, єврейського капіталу. Таким чином, українські політики не могли користуватись фінансивими можливостями, які мали російські партії: від чорносотенців до більшовиків.

Єдиним прошарком, що становив базу українського політичного руху залишалось селянство. Але для опанування селянської стихії вимагались великі професійні, організаційні, ідеологічні сили, яких не мала нечисленна українська інтелігенція. Потрібен був і історичний час, але його, як відомо, не вистачало.

Національний рух жорстко переслідувався царатом. Ці репресії були направлені в більшій мірі не проти його демократичної революційності, а проти т. зв. малоросійського сепаратизму.

Певні відмінності мав західноукраїнський рух. Політичні реформи в Австрійській імперії, що почалися на два десятиліття раніше, ніж в Росії, сприяли більшому динамізму, більшим успіхам західноукраїнського політичного руху. Так австрійський уряд час від часу використовував діяльність українців на противагу полякам, надаючи українцям певних поступок. Російська імперія також використовувала Західну Україну організуючі москвофільський політичний рух. Великий вплив на політичну діяльність в Галичині мала греко-католицька церква, її діячі. Саме священики очолили політичний рух на Західній Україні, доносили його до селянства, перекладали складні політико-ідеологічні конструкти на звичайну мову, чого не було в підросійській Україні. Західні українці вибирали між Австрією, Росією, а згодом і Польщею.

Формування східних і західних політиків в різних умовах, з різними впливами призвели згодом, в 1918−1920 рр., до фатальних наслідків через непорозуміння в головних питаннях державного будівництва молодої української держави.

Діяльність українців вирізнилась в окремий чинник політичного руху з середини XIX ст., з появою різночинської інтелігенції і виробленням нею свого розуміння національної ідеї. В 1846−1847 рр. в Києві засновується і діє таємне Кирило-Мефодіївське товариство. На його чолі стояли, відомий історик М. Костомаров (1817−1885), чиновник канцелярії Київського генерал-губернатора М. Гулак (1821−1899) і вчитель кадетського корпусу В. Бєлозерський (1823−1899). Пізніше до них приєднались П. Куліш (1819−1897) та Т. Шевченко (1814−1861). Товариство охоплювало 12 постійних членів та приблизно сто співчуваючих − вчителів, викладачів, чиновників, студентів. Програма товариства викладена в праці М. Костомарова «Закон Божий. Книга буття українського народу» та в Статуті. В цих документах

проголошувались антикріпосницькі, антицаристські ідеї, необхідність створення всеслов'янської федерації з вільних слов'янських народів та національного визволення України. Товариству не вдалось розгорнути свою діяльність. Вона обмежилась кількома зборами, де обговорювались різноманітні проблеми, спробою розповсюдження своїх теорій, вироблення проекту про заснування сільських шкіл. Скоро товариство було викрито, а його діячі зазнали репресій. Діяльність Кирило-Мефодіївського товариства свідчила про зростання національної самосвідомості, про початок національного руху, який перебував ще в межах культурно-просвітницької програми.

Важливим кроком у розвитку національного руху стала діяльність Громад − напівлегальних товариств ліберально-демократичної інтелігенції. Перша така Громада створена В. Антоновичем, діяла на початку 60-х рр. в Києві. За її зразком почалось створення таких товариств в інших містах України. Громади діяли в Єлизаветграді, Одесі, Полтаві, Харкові, Чернігові і серед українців Санкт-Петербургу. Метою громадівського руху був розвиток українського культурного життя в усіх його вимірах − видавнича діяльність, народна освіта, літературна діяльність. Деякі з Громад, переживши репресії царату проти українства (Валуєвський – 1863 р. та Емський – 1876 р. укази), зміцнивши внутрішню структуру і склад учасників, збереглись до 90-х рр. XIX ст. Самою відомою стала діяльність т. зв. Київської «Старої громади». Її очолив В. Антонович (1834−1908), а до складу входили такі відомі представники української інтелігенції як М. Драгоманов (1841−1895), П. Житецький (1836−1911), М. Зібер (1844−1888), О. Кистяківський (1833−1885), Т. Рильський (1841−1902), М. Старицький (1840−1904), П. Чубинський (1839−1884). Підсумком діяльності Громад стало утворення в 1897 р. Загальної української безпартійної демократичної організації.

Навіть обмежена культурно-просвітницька діяльність і програма українофілів розглядалась імперським режимом як політичний сепаратизм − тобто спроба відірвати Україну від Росії. Таким чином, український рух опинився на роздоріжжі − культурництво не давало ніяких результатів, а ідеї політичного руху лякали національну інтелігенцію.

Одним з перших, хто проголосив необхідність вести політичну боротьбу став Михайло Драгоманов. Вимушений залишити Батьківщину, М. Драгоманов в Женеві починає видавати перший український соціально-політичний часопис «Громада». В журналі друкуються матеріали присвячені вирішенню національного питання, розвитку України в складі Росії, необхідності вироблення політичної програми

національного руху. Разом з М. Зібером, С. Подолинським (1850−1891) М. Драгоманов звертається до західноєвропейської політичної думки − до соціалізму та марксизму. Намагаючись пристосувати ці доктрини до української дійсності, він відкидає ідеї радикальної боротьби та централізму, натомість пропагує т. зв. етичний соціалізм, громадивський соціалізм, федералізм. Не знайшовши підтримки серед старшого покоління українофілів, М. Драгоманов вимушений був припинити свою активну політичну діяльність за кордоном.

Таким чином, суспільний рух на Наддніпрянській Україні в другій половині XX ст. обмежувався культурно-просвітницькими вимогами. Лише в 90-х рр. українська студентська молодь долучається до політичної боротьби через створення таємних студентських політичних гуртків в Києві, Харкові, Петербурзі (Росія), Дерпті (Росія–Латвія), а згодом Братства Тарасівців (1891–1893).

Революція 1848 р. в Австрійській імперії, проголошення конституційної, парламентської монархії (утворення нової держави – Австро-Угорщини), початок економічних реформ створили більш сприятливі умови для політичної активності західних українців. В умовах революції 1848 р. у Львові утворився перший в історії представницький політичний орган українців в Галичині − Головна руська рада. До неї входили представники нечисленної національної інтелігенції і духовенства. Загалом тридцять чоловік. Головою ради став єпископ Г. Яхимович (1792–1863). Руська рада представляла інтереси українців на слов’янському конгресі в Празі, очолила вибори українців до парламенту у Відні, створила мережу місцевих комітетів, розгорнула культурно-просвітній рух. Головною метою організації стала боротьба за відокремлення Української Галичини (східної) від Польської (західної), та створення на землях першої національної автономії у складі Австрії. Але надії українців на імперську адміністрацію виявились марними, почався період контрреформ і боротьби проти любих виявів національної самостійності. Опинившись перед тиском уряду Головна руська рада саморозпустилася в 1851 р.

Друга половина XIX ст. в Західній Україні пройшла у боротьбі москвофілів, народовців і радикалів. Москвофіли здебільш об’єднували консервативну інтелігенцію та духовенство старшого покоління, яке розчарувалось у австрійській орієнтації, у змозі австрійців вирішити українську проблему. Тому вони звернули свої погляди до правлячих кіл Росії, сподіваючись на її допомогу. Але отримуючи фінансову та моральну підтримку від Російської імперії потрібно було поступитись своїми поглядами. Що і було зроблено. Москвофіли проголосили існування єдиного, т. зв. «панруського» народу від Карпат

до Камчатки, відмовили в існуванні українській мові, натомість проголосили єдність «руського» народу. Москвофіли виступили проти греко-католицької віри, пропагували перехід у православ'я. Критикуючи цю течію, разом з тим, треба зрозуміти, що це була відповідь частини західноукраїнської інтелігенції на процеси полонізації, румунізації та мадяризації. Але молодь не поділяла таких поглядів. Вона виступила з їх критикою і розпочала активну діяльність в культурно-просвітній сфері. Головним аспектом діяльності стала пропаганда української мови, орієнтація на культурні потреби народу. Ось чому прихильники цієї течії обрали назву народовців. Завдяки зусиллям народовців були засновані товариство «Просвіта» (1868 р.), Товариство ім. Шевченка (1873 р.), відкрито велику кількість народних бібліотек. Таким чином діяльність народовців нагадувала культурно-просвітню діяльність східноукраїнських Громад. Звичайно, що наступним кроком суспільного руху в Галичині стало виокремлення з народовців радикальної течії, утворення політичної організації. У 1890 р. була заснована Русько-українська радикальна партія на чолі з І. Франко (1856−1916) та М. Павликом (1853−1915). Програма партії включала в себе боротьбу за громадянські та національні права, вимоги економічні та освітні. Партія проголосила боротьбу за автономію, яка б «поєднувала силу монархії з найкращим культурним та національним розвитком народів». Партія стала в опозицію до уряду і боролась проти «угодовської» політики народовців з поляками та австрійцями у суспільному житті. Русько-українська радикальна партія стала зародком нових політичних організацій. В 1899 р. частина партії стала на соціалістичні позиції і заснувала Українську соціал-демократичну партію на чолі з М. Ганкевичем (1869−1931). В тому ж році інша, ліберально-демократична частина оформилась в Національно-демократичну партію. На чолі партії стали Ю. Романчук (1842–1932), К. Левицький (1859–1941), М. Грушевський (1866–1934). Вона стала найбільш впливовою та представницькою силою західних українців. Програмою максимум була незалежна, об'єднана Україна. Найближчою метою проголошувалось створення української автономії на землях Галичини та Буковини.

Таким чином, в кінці XIX ст. в обох частинах України, формується розуміння необхідності політичної діяльності, політичної боротьби. Політична боротьба в підавстрійській Україні вже велась в легальних умовах. Політичний рух українців в Російській імперії зосереджувався в підпіллі. Характерною рисою, що об'єднував західників і східняків стала ідеологія федералізму і автономії. В Галичині панування цієї ідеології стало результатом особливої, відносно

ліберальної національної політики. В Наддніпрянські українські політики підійшли до революції 1917−1921 рр. з ідеями федералізму і автономії у складі «великих» держав. Незалежність 1918 р. стала «несподіванкою» як для західників, так і східняків. Ідея незалежності залишалась на марйнесі.

Неабияку роль в національному політичному русі відіграла молодь яка не хотіла миритись з поміркованою політикою старшого покоління. Молодь і старше покоління не знаходили спільної мови, що виявилось згодом, в 1917−1921 рр. В національному русі був відсутній «зв'язок поколінь» в ідеях і досвіді боротьби.

Незважаючи на ці, та ряд інших специфічних рис український національний рух перестав бути «забавою і екзотикою» поступово набираючи силу.

Джерела і література

1 Кротов, А. М. Политическая составляющая польских культурно-просветительских интересов в Беларуси во второй трети XIX в. / А. М. Кротов // Беларусь і суседзі : гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы : матэрыялы III Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Гомель, 30 верасня − 1 кастрычніка 2010 г. / [рэдкалегія: Р. Р. Лазько (адказны рэдактар), М. М. Мязга, Д. М. Талочка]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2010. – С. 79−86.

2 Гарматный, В. П. Нацыянальна-дэмократычны рух Заходняй Беларусі ў 1921−1939 гг. / В. П. Гарматный // Беларусь і суседзі : гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы : матэрыялы III Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Гомель, 30 верасня − 1 кастрычніка 2010 г. / [рэдкалегія: Р. Р. Лазько (адказны рэдактар), М. М. Мязга, Д. М. Талочка]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2010. – С. 246−252.

3 Бобіна, О. В. Особливості політичного руху в Україні, загальноросійські партії в Україні і їх ставлення до українського питання в XIX – на початку XX ст. / О. В. Бобіна // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны: зборнік навук. артыкулаў. Вып. 3. / рэдкал. : Р. Р. Лазько (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2014. – С. 53–57.

Oleh Bobyna. National Ukrainian political movement: phases, especially the beginning of activities. *The Ukrainian national political movement has its special features. These features were generally formed in the second half of the XIX century. The author describes the main characteristics of the national political movement and the basic steps of its development. The special attention has been paid to the conditions in which the Ukrainian politicians, parties and organizations started their activities. The author has made the conclusion that the Ukrainian influence was present in the narrow circle of the Ukrainian intelligentsia.*

УДК 930.85(476.2-21Гомель)

С. А. Балахонаў
Сярэдняя школа № 24 г. Гомеля

КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЯ ПРАСТОРА ГОМЕЛЯ І ПАМЯЦЬ ГОРАДА (ПАСТАНОЎКА ПРАБЛЕМЫ)

У артыкуле разглядаецца асаблівы від сацыяльнай памяці, выражаны паняццем памяць горада як асновасяжнай з'явы культурна-гістарычнай прасторы. На матэрыялах пераважна XVI – пачатку XXI ст. акрэслены шэраг вузлавых пытанняў фарміравання, развіцця і функцыянавання ў Гомелі памяці горада як сацыяльнага інстытута і інфармацыйнай сістэмы. Пастаўлена праблема аб прычынах функцыянальнага збою, у выніку якога інстытуалізаваныя формы памяці горада выяўляюцца няздольнымі да рэтрансляцыі назапашанага і даследаванага гомельскага наратыва на шырокае кола гараджан.

Пад культурна-гістарычнай прасторай варта разумець сукупнасць спароджаных ці справакаваных дадзеным горадам культурных і гістарычных феноменаў, якія характарызуюцца рознай ступенню актуальнасці ў канкрэтны перыяд гісторыі. Магчымасці культурна-гістарычнай прасторы звязаны з сацыяльнай памяццю, якая ў дачыненні да горада можа быць вызначана як *памяць горада*. З аднаго боку яна ўяўляе сабой сацыяльны інстытут, які ўключае ў сябе ўстановы культуры, музеі, архівы і іншыя інстытуцыянальныя формы арганізацыі, якія рэгулююць прастору гарадской культуры і яе суб'ектаў. З іншага боку – гэта складаная інфармацыйная сістэма, у якой дзейнічаюць асаблівыя заканамернасці захавання, пераасэнсавання і аднаўлення (рэтрансляцыі) інфармацыі аб мінулым. У ёй ствараюцца мнеманічныя праграмы інфармацыйнай дзейнасці, якія пэўным чынам суадносяцца з мнеманічным зместам вербальных (вусных і пісьмовых) і невербальных (напр., помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва) тэкстаў [14].

Горад Гомель валодае сваёй адметнай культурна-гістарычнай прасторай, фарміраванне, развіццё, трансфармацыя і сучасны стан якога ў цэлым звязана з асаблівасцямі яго гістарычнага лёсу і сучаснасці. *Памяць горада* як сацыяльны інстытут у Гомелі склалася даволі позна. Можна меркаваць, што ў XI–XVIII стст. функцыі адпаведных установаў часткова выконвалі храмы і рэзідэнцыі гарадскіх уладароў, дзе захоўвалася разнастайная дакументацыя (“листы к твердости славное и святое памяти Королей Их милости”, “скрыни с правами тыми церковными”, “книги замку Гомелского”, “выписы” з іх),

маглі існаваць скрыпторыі і, тэарэтычна, нават школы [6, с. 58, 200–201; 5, с. 54; 1, с. 42–45]. Пад кантролем царкоўных і свецкіх улад магло ажыццяўляцца складанне мясцовых летапісаў, але выразных указанняў на гэта ў гістарычных крыніцах пакуль не выяўлена. У кожным разе нават з наяўнай інфармацыі цяжка меркаваць аб спосабах рэтрансляцыі звестак з гісторыі Гомеля на розныя катэгорыі яго жыхароў і аб факце падобнай рэтрансляцыі як такой.

Відавочна, што напрацаваны на пэўных этапах існавання Гомеля гарадскі наратыў на працягу азначанага перыяду неаднойчы змяняў свой змест па прычыне войнаў, прыродных і іншых катаклізмаў (напр., пажараў у мірны час), эпідэмій. Гарадская традыцыя адрознівалася перарывістасцю. Пры такім раскладзе праблематычным выглядае пытанне, ці з’яўляліся арганічным элементам *памяці горада* веды гамяльчан другой паловы XVIII ст. (паваротны момант гомельскай гісторыі) пра радзімічаў, найбуйнейшым горадам племяннога саюза якіх у свой час быў Гомель. Звесткі пра радзімічаў утрымліваюцца ў розных рэдакцыях і спісах “Аповесці мінулых гадоў”, блытана сустракаюцца ў хроніцы М. Стрыйкоўскага, працы А. Нарушэвіча. Зрэшты, ці былі носьбіты гэтай інфармацыі ў Гомелі, невядома. Як невядома, ці існавалі ў *гарадской памяці* Гомеля таго ж часу звесткі пра “печать местьскую з гербом крыжа”, якую горад атрымаў 1560 г. прывілеям вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста, або пра яе гомельскія жыхары забыліся задоўга да сярэдзіны XVIII ст. Пытанне застаецца без адказу, арыгінал выявы герба дагэтуль не знойдзены, а сама падзея адсутнічае ў сучаснай гомельскай гарадской свядомасці.

У XIX – пачатку XX ст. у Гомелі адбывалася інстытуалізацыя культуры як такой, што знайшло сваё праяўленне ў адкрыцці і працы на розных адрэзках часу навучальных устаноў (ланкастэрская школа, прагімназіі, гімназіі, вучылішчы) і ўстаноў культуры (тэатр, бібліятэкі). Аднак без дадатковых даследаванняў цяжка сказаць, ці спрыялі яны інстытуалізацыі *памяці горада*, бо невядома, у якой ступені навучэнцы адукацыйных устаноў, карыстальнікі бібліятэк, наведвальнікі тэатра маглі там пачарпнуць веды з гісторыі Гомеля ці яго тагачаснага жыцця. Больш выразныя рысы інстытуалізацыі *гарадской памяці* назіраюцца ў дзейнасці беларускага асяродка т.зв. “Румянцаўскага гуртка” як праобраза навукова-даследчай установы, спецыялізаванай на краёвай (рэгіянальнай), але не выключна гомельскай, гісторыі [4, с. 146]. Так, у выданнях І. Грыгаровіча сярод крыніцаў па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага былі апублікаваны дакументы, якія маюць дачыненне і да Гомеля, а сярод фальклорных запісаў, зробленых З. Даленгам-Хадакоўскім, пэўная частка мае гомельскае паходжанне.

Гомель, яго гісторыя і актуальная на той час прастора паступова становяцца аб'ектамі рэфлексіі – публіцыстычнай і навуковай. У 1848 г. у часопісе "Иллюстрация" быў змешчаны артыкул В. Шабякіна "Несколько слов о местечке Гомле", дзе аўтар паспрабаваў ахарактарызаваць Гомель таго часу і вызначыць адметнасці яго гістарычнага шляху. На мяжы стагоддзяў з'явілася кніга Л. Вінаградава, якая стала першай вядомай у сваім родзе спробай асэнсаваць лёс горада ад старажытных часоў да канца XIX ст. У той самы час актыўную збіральніцкую і даследчую дзейнасць вёў і Е. Раманаў. Вывучаючы з пункта гледжання археалогіі, гісторыі, этнаграфіі і фальклору беларускія губерні, ён немалую ўвагу надаў Гомелю з яго тагачаснымі ваколіцамі. Можна дапусціць, што вытокі іх даследчай актыўнасці звязаны з пачаткамі інстытуалізацыі *гарадской памяці* Гомеля. Разам з тым застаецца адкрытым пытанне аб шырыні ахопу гараджан, здабытымі навукоўцамі ведамі. Пра гэта маглі б часткова сведчыць звесткі пра распаўсюджанне тыражоў іх выданняў сярод жыхароў Гомеля і Гомельскага павета. Папярэдне ж можна выказаць меркаванне, што сам факт збору Е. Раманавым краёвых матэрыялаў, мог даваць імпульс для рэфлексіі (*"роздуму аб гомельскім"*) яго памочнікам, рэспандэнтам і іх асяродкам.

Далейшае станаўленне гомельскай *памяці горада* як сацыяльнага інстытута звязана з навейшай гісторыяй. З 1919 па 1941 г. у Гомелі ці не ўпершыню з'явіўся комплекс спецыялізаваных устаноў, якія мелі магчымасць вывучаць, захоўваць і рэтрансляваць гарадскую гісторыю (краязнаўчы музей, абласная бібліятэка, педагагічны інстытут, тэатр, радыёстанцыя, рэдакцыі газет). Аднак спецыфіка таго часу, звязаная з разгортваннем культурнай рэвалюцыі і насаджэннем бальшавіцкай ідэалогіі, відавочна адбівалася на змесце *памяці горада*, уплывала на стан культурна-гістарычнай прасторы Гомеля. Гэта здзяйснялася ў рамках барацьбы з перажыткамі "старога рэжыму", рэлігіяй і нават у сувязі з перабудовай часткі горада, якая суправаджалася адпаведнай ідэалагічнай рыторыкай. Так, у 1937 г. быў закрыты, а ў 1940 г. зруйнаваны касцёл Унебаўзняцця Найсвяцейшай Панны Марыі [2, с. 102–104]. Узведзены ў 1929–1931 гг. на месцы гарадскіх сядзіб дом-камуна абвяшчаўся будынкам новай формы арганізацыі жылля і побыта працоўных [5, с. 221]. Застаецца адкрытым пытанне, ці знаходзіліся ў той час сярод удзельнікаў інстытуалізаваных форм *памяці горада* людзі, якія выказваліся за захаванне тых ці іншых гарадскіх аб'ектаў.

Віхура Другой сусветнай вайны сур'ёзна закранула культурна-гістарычную прастору Гомеля і *памяць горада*. Але ў пасляваенныя гады ў Гомелі ўзніклі дзясяткі новых устаноў культуры, у дзейнасці

якіх у той ці іншай ступені прысутнічаў рэгіянальны кампанент. Даследаванне гісторыі, этнаграфіі, фальклору, літаратуры Гомеля і Гомельшчыны ўзмацнілася, дзякуючы рэарганізацыі ранейшага педагагічнага інстытута ў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт (1969 г.). Працай многіх навукоўцаў гэтай установы да нашага часу назапашаны вялікі масіў адпаведных ведаў. Аднак большасць дасягненняў па шматбаковым вывучэнні Гомеля застаюцца замкнутымі ў межах акадэмічнага асяроддзя, уплываючы пераважна на спецыялістаў і даволі вузкія колы зацікаўленых асоб па-за названым асяроддзем. Уплыў на масавую аўдыторыю гараджан практычна не заўважаецца.

Адным з яскравых прыкладаў таму з’яўляецца надзвычайна нізкая колькасць помнікаў гістарычным асобам і дзеячам культуры, звязаных з Гомелем. У Гомелі не святкуецца ні вызваленне горада вялікім князем Альгердам ад мангола-татараў, ні вяртанне горада ў склад БССР у выніку т. зв. “другога ўзбуйнення”. Сведчаннем слабасці ўплыву акадэмічнага асяроддзя на паўсядзённае разуменне гамяльчанамі свайго горада могуць служыць таксама ступень і характар прысутнасці гістарычнай тэматыкі ў сучасных песнях, прысвечаных Гомелю, змест якіх часта зводзіцца да стэрэатыпнага набору са спрошчанай схемы гомельскай гісторыі [9]. Аўтары канвертуюць у сваёй творчасці пэўны *інфармацыйны згустак*, што існуе навокал, узнікшы ў выніку пастаяннай шырокай рэтрансляцыі нейкай сукупнасці фактаў, вобразаў, стэрэатыпаў.

Як бачым наяўнасць інстытуалізаваных форм *памяці горада* не гарантуе апанавання масавай свядомасцю гараджан. Можна сцвярджаць, што гомельскі гарадскі наратыў у *памяці горада* як інфармацыйнай сістэме прысутнічае ў недастатковай ступені. Мноства вусных гарадскіх паданняў і легенд, якія ўмоўна можна абазначыць як сучасныя, дагэтуль не сабраны ў адзіны комплекс і не зведалі класіфікацыі. Гэта паданні пра незайздросны лёс дома, збудаванага з выкарыстаннем цэглы разбуранага касцёла, пра скульптурную кампазіцыю фантана, дзе фігуры пры поглядзе зверху ўтваралі свастыку, пра дэмантаж у парку фігуры Сталіна з помніка, дзе прысутнічала фігура Леніна і інш. [8]. Часта гэты пласт фальклору існуе ў невялікіх групах носьбітаў, не ахопліваючы агульнагарадскую свядомасць. Самымі вядомымі ў маштабе горада з’яўляюцца легенда пра паходжанне Гомеля (“Го! Го! Го! Мель!”) і паданні пра падземныя хады пад паркам і ракой Сож. Верагодна, што ў абодвух выпадках мы маем справу з вуснымі тэкстамі, якія сягаюць у часы не ранейшыя за “румянцаўскую эпоху”.

Ці існавалі больш архаічныя легенды пра заснаванне Гомеля, дакладнай інфармацыі няма. Краязнавец А. Рогалеў узгадвае “асколак”

падання пра разбойніка Гома як легендарнага заснавальніка горада [12, с. 46]. Мы ж лічым, што легенды, якія маглі існаваць да канца XVIII ст., у XIX ст. паступова сцерліся з *памяці горада* і ўжо ў часы даследчай актыўнасці Е. Раманава гамяльчанам былі невядомыя. Гэты даследчык, збіраючы фальклор у Гомелі і наваколлі, падобнай легенды не зафіксаваў, толькі ў лісце да гісторыка літаратуры А. М. Весялоўскага перадаў змест “смутного предания” пра вёску Валатава (зараз – у межах Гомеля) і волатаў [3, с. 246]. З іншага ж боку легенды і паданні, звязаныя з горадам, маглі існаваць не толькі ў беларусаў і старавераў Гомеля і Гомельскага павета (асноўныя рэспандэнты Раманава і яго памочнікаў), але і ў яўрэйскім асяроддзі. Аднак, нягледзячы на тое, што колькасць яўрэяў (па роднай мове) паводле перапісу 1897 г. у Гомелі складала 10 435 чалавек (59 % ад усіх гамяльчан) [7, с. 254–255] іх культурная спадчына дагэтуль не зведала шырокага комплекснага даследавання, у т. л. і на наяўнасць гарадскіх легенд.

Разам з легендамі забываюцца і колішнія афіцыйныя і неафіцыйныя мікратапонімы. Назвы Каўказ, Амерыка, Свісток і некаторыя іншыя ў наш час хоць і не ўжываюцца для абазначэння гарадскіх тэрыторый, дзе яны бытавалі ў канцы XIX – пачатку XX стст., але пра іх нярэдка ўзгадваюць краязнаўцы, публіцысты, яны рэгулярна фігуруюць у краязнаўчых конкурсах для школьнікаў. Такія ж назвы як Багуслаўскі фальварак, Гецьманка, Бэркаў хутар, Лібаўскі гарадок, Красная Грыва ў масавай гарадской свядомасці адсутнічаюць. Зрэшты, паралельна працэсам забыцця адных мікратапонімаў адбываецца з’яўленне іншых: Стары Аэрадром, Кітайская Сцяна, Пентагон, Лінія. Пры гэтым узровень самарэфлексіі жыхароў Гомеля як гараджан даволі нізкі, пра што сведчаць безыменнасць многіх гарадскіх аб’ектаў (напр., мастоў, вострава на р. Сож), наяўнасць вялікай колькасці безаблічных нумарных назваў мікраараёнаў (напр., 17-ы, 104-ы), адсутнасць ходкіх жартаўлівых найменняў для помнікаў і іншых славутасцяў горада.

Пераважная большасць пісьмовых вербальных тэкстаў, звязаных з Гомелем, у інфармацыйнай сістэме *памяці горада* прысутнічае ў нязначнай ступені. Літаратурныя творы пра Гомель, якія б лічыліся знакавымі для гамяльчан, у гарадской свядомасці адсутнічаюць. Гэта тычыцца рамана Ільі Эрэнбурга “Бурнае жыццё Лазіка Ройтшванеца” (1927), частка дзеяння якога разгортваецца ў Гомелі часоў нэпа, некаторых твораў Івана Шамякіна – напр., “Сэрца на далоні” (1964), “Атланты і карыятыды” (1974), дзе пазнаюцца пэўныя гомельскія рэаліі 1960–1970-х гг. Названыя творы маглі б стаць своеасаблівай літаратурнай візітоўкай Гомеля, адпраўным пунктам для насычэння культурнагістарычнай прасторы горада новымі цікавосткамі (помнікамі па

матывах сюжэтаў, экскурсійнымі маршрутамі, тэматычнымі кавярнямі), аднак іх актуалізацыяй на сёння займаюцца выключна энтузіясты.

Варта аддаць належнае навукоўцам і краязнаўцам, якія імкнуцца данесці розныя пласты гомельскай гісторыі да гараджан праз кніжныя і газетныя публікацыі, інтэрв'ю, публічныя выступы (А. Макушнікаў, А. Яшчанка, В. Марозаў, В. Лебедзева, Ю. Глушакоў, Я. Малікаў і інш.). Аднак разам з тым дагэтуль няма навукова-папулярнага выдання, якое ў фармаце падручніка расказвала б пра гісторыю Гомеля ад старажытных часоў да нашых дзён. Адсутнічае таксама і кніга, дзе былі б сабраны займальныя выпадкі з гомельскай гісторыі розных перыядаў.

Што тычыцца невербальных тэкстаў у *гарадской памяці* Гомеля, то і тут прысутнічаюць пэўныя асаблівасці. Заснаванне горада ў лясной зоне, знаходжанне па-за галоўнымі гандлёвымі шляхамі на доўгі час прадвызначылі спецыфіку яго архітэктурнага аблічча – асноўным матэрыялам на працягу, прынамсі, васьмі стагоддзяў тут была драўніна. І хаця ёсць археалагічныя сведчанні пра існаванне ў Гомелі на розных этапах гісторыі каменных ці каменна-цагляных забудоў (храмы), аж да другой паловы XVIII ст. нават рэзідэнцыі уладароў узводзіліся з дрэва (напр., перабудаваны дубовы замак князя Міхала Чартарыйскага). Улічваючы фізічныя ўласцівасці дадзенага матэрыялу і гістарычны кантэкст, у якім існаваў Гомель, верагоднасць захавання да нашых дзён будынкаў эпохі сярэднявечча ці першага перыяду Новага часу выявілася немагчымай. Адзіным выключэннем стала драўляная Ільінская царква 1793 г. Верагодна, што ў выніку перабудовы Гомеля пры Румянцавых, а таксама з прычыны пажару ў 1856 г. будынкаў, узведзеных раней канца XVIII ст., у Гомелі не захавалася. Тая ж Ільінская царкава ў 1898 г. лічылася сярод культавых пабудоў Гомеля найстарэйшай [13, с. 69].

Атрымліваецца, што архітэктурны кампанент культурна-гістарычнай прасторы Гомеля (нават у сённяшніх яго граніцах) вядзе свой адлік у лепшым выпадку з канца XVIII – пачатку XIX ст. Будынкі канца XVIII – першай паловы XX ст. пры ўмове іх захаванасці маглі б скласці архітэктурнае ядро гомельскай культурна-гістарычнай прасторы, якое здолела б адной сваёй прысутнасцю ўздзейнічаць на гараджан, а значыць выконваць ролю рэтранслятара ў інфармацыйнай сістэме *памяці горада*. Мусім пагадзіцца з расійскім даследчыкам Дз. Равінскім, які адзначыў, што "любы чалавек, апынуўшыся ў горадзе, зведвае ўздзеянні, якія, не ўспрымаючыся рацыянальна, афарбоўваюць усё ў спецыфічныя таны. Гравітацыйна-тэктанічнае ўздзеянне архітэктурных пабудоў, унутраная пульсацыя горада спрычыняецца да фарміравання асаблівых уласцівасцяў гараджан" [11, с. 411–412]. Аднак тое, што магло пры лепшым гістарычным раскладзе стаць такім ядром,

да нашага часу дайшло ў надзвычай перафарматаваным выглядзе з прычыны войнаў, антырэлігійнай барацьбы, практыкі бяздумных разбурэнняў і перабудоў. Цяжка сказаць, якое гравітацыйна-тэктанічнае ўздзеянне робяць на гараджан гмахі "Гіпражыўмашу" і "Белтэлекаму", узведзеныя ў гістарычным цэнтры (адпаведна ў 1974 г. і 1981 г.) за кошт зруйнавання гарадскіх сядзіб і іншых будынкаў канца XIX – пачатку XX ст. На жаль, практыка вызвалення тэрыторыі ад гістарычнай забудовы працягваецца і ў нашы дні. Зносяцца ці непазнавальна рамантуюцца дамы пачатку XX ст., адметныя сваім драўляным дэкорам. Праекты музейных кварталаў (скансенаў) застаюцца дыскусійнымі [10].

Такім чынам, нават абеглы агляд феномена *памяці горада* ў кантэксце культурна-гістарычнай прасторы Гомеля выяўляе шэраг праблемных момантаў, для раскрыцця якіх патрабуецца глыбокая даследчыцкая праца. Асобнае месца сярод іншых займае праблема функцыянальнага збою механізмаў рэтрансляцыі гарадскога наратыва. Яе вырашэнне ўяўляе не толькі даследчыцкі інтарэс, але і мае практычнае значэнне для далейшага функцыянавання і развіцця культурна-гістарычнай прасторы Гомеля.

Спіс выкарыстанных крыніц і літаратуры

1 Белорусский архив древних грамот : [сборник]. – М.: Типография С. Селивановского, 1824. – 148 с.

2 Васькоў, У. І. Каталікі на абшарах Панізоўя і Севершчыны : Гісторыя гомельскага дэканата / У. І. Васькоў ; навук. рэд. А. В. Белы, В. С. Пазнякоў. – Мінск: Про Хрысто, 2011. – 360 с.

3 Веселовский, А. Мелкие заметки к былинам / А. Веселовский // Журнал Министерства народного просвещения. – 1896. – Ч. CCCVI. – С. 235–277.

4 Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 519 с.

5 Гомель : Энцикл. справ. / редкол.: И. П. Шамякин [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1990. – 527 с.

6 Макушников, О. А. Гомель с древнейших времён до конца XVIII в. Историко-краеведческий очерк / О. А. Макушников. – Гомель: РУП «Центр научно-технической и деловой информации», 2002. – 244 с.

7 Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под. ред. Н. А. Тройницкого. – Санкт-Петербург : Типография АО «Слово», 1903. – Вып. XIII : Могилевская губерния. – 276 с.

8 Пошукі старога Гомеля [Відэазапіс] : дакум. фільм / М. Булавінская, С. Ляпін ; навук. кансульт. Ю. Панкоў, Я. Малікаў, У. Васькоў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=1WcWE7pM1tQ. – Дата доступу: 11.03.2016.

9 Прахарэнка, І. Стэрэатыпны вобраз Гомеля ў сучаснай песні / І. Прахарэнка, Н. Сідоранка ; навук. кір. С. А. Балахонаў, А. Н. Назаранка [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: http://www.mazdzalina.org/stereatypny-vobraz-homiela-u-sucasnaj-piesni. – Дата доступу: 25.02.2016.

10 Пригодич, Н. Не потерять бы лицо : В чем уникальность Гомеля? [интервью с Е. Маликовым и С. Кривошеевым] / Н. Пригодич [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gp.by/category/society/news15542.html. – Дата доступа: 10.03.2016.

11 Равинский, Д. К. Городская мифология / Д. К. Равинский // Современный городской фольклор. – М., 2003. – С. 409–419.

12 Рогалев, А. Ф. Гомель. Страницы истории, формирование улиц, местные тайны и загадки / А. Ф. Рогалев. – Гомель: Барк, 2014. – 248 с.

13 Романов, Е. Две надписи в церквах Гомельского уезда / Е. Романов // Сборник статей «Могилевских губернских ведомостей» / под ред. Е. Р. Романова. – Могилев–Губернский, 1900. – Вып. 1. – С. 69–71.

14 Устьянцев, В. Б. Культурно-историческое пространство крупного города: исходные структуры / В. Б. Устьянцев [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.comk.ru/HTML/ustyancev_doc.htm. – Дата доступа: 25.09.2015.

Siarhei Balakhonau. Cultural and historical space of Homieĺ (Gomel) and urban memory (problem statement). *The article studies the special type of social memory named urban memory being a fundamental phenomenon of cultural and historical space. A row of key-questions of formation, development and functioning of urban memory in Homieĺ as a social institute and an information system is preferentially contoured on materials of the period between the XVIth and XXIst centuries. The issue about reasons of the functional failure resulted in the incapability of the institutionalized forms of urban memory to retranslate the accumulated and researched Homieĺ narrative to a wide range of citizens is raised.*

УДК 94:352.075.1 (476.2-37) «189»

Г. А. Аляксейчанка

Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны

МУНІЦЫПАЛЬНАЯ РЭФОРМА 1890-Х ГГ. У ПАВЯТОВЫХ ЦЭНТРАХ ПАЎДНЕВА-УСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

У артыкуле разглядаюцца пытанні, звязаныя з асаблівасцямі перабудовы муніцыпальнай сістэмы кіравання ў павятовых цэнтрах паўднева-усходняй Беларусі ў выніку пераходу на Гарадавое палажэнне 1892 г. Асаблівая ўвага надаецца зместу арганізацыйным прынцыпам і галоўным напрамкам муніцыпальнай палітыкі, яе накіраванасці на развіццё гарадоў.

У айчыннай гістарычнай урбаністыцы апошнім часам назіраецца пашырэнне даследаванняў па гісторыі гарадскіх рэформ XIX ст. і выкліканых імі працэсаў фарміравання і дзейнасці органаў муніцыпальнай улады. У навейшых публікацыях гэтая праблематыка разглядаецца не толькі в агульным фармаце [1–4], але і на рэгіянальным узроўні [5–6]: пры гэтым закранаюцца мала даследаваныя раней аспекты дзейнасці гарадскога самакіравання (адукацыя, камунальная гаспадарка) [7–8]. Аднак у агульным полі гістарыяграфіі праблемы па ранейшаму застаецца недастаткова распрацаванай гісторыя муніцыпальнай сістэмы ў малях і сярэдніх павятовых цэнтрах [5, с. 36; 6, с. 118].

Прапанаваны артыкул з'яўляецца працягам спецыяльнага даследавання гісторыі муніцыпальных рэформ у павятовых цэнтрах паўднева-усходняй Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. [Гл.: 5].

Агульнае асэнсаванне спецыфікі правядзення муніцыпальнай рэформы 1890-х гг. у Беларусі павінна ўлічваць фактар "спазнення" папярэдняй гарадской рэформы [9, с. 178], а таксама – расцягнуты ў часе механізм яе паэтапнай рэалізацыі. На гэтым плане варта нагадаць, што з пераходам на Гарадавое палаженне 1870 г. у беларускіх губернях толькі ў канцы 1870-х – пачатку 1880-х гг. разгарнуўся складаны працэс фарміравання арганізацыйнай структуры і кадравага складу муніцыпальнай сістэмы кіравання, яе нарматворчых прэрагатыў, асноўных напрамкаў і механізмаў дзейнасці. Для такіх невялікіх паўаграрных гарадоў, як Мазыр, Рэчыца, Рагачоў этап станаўлення новай муніцыпальнай улады стаў сапраўдным выпрабаваннем:складанасці фарміравання фінансава-бюджэтнай базы, адсутнасць кваліфікаваных кадраў, дэфіцыт вопыту ў вызначэнні канкрэтных напрамкаў, задач і метадаў рэфармавання гарадскога жыцця [4, с. 39]. Тым не меньш гэтыя першыя крокі былі зроблены: на памежжы 1880-х – 1890-х гг. у павятовых цэнтрах азначанага рэгіену назіралася стабілізацыя электаральных працэдур і механізма фарміравання выбарных распарадчых органаў (гарадскіх дум) і іх выканаўчых структур (гарадскіх ўпраў), у асноўным акрэсліўся агульны фармат муніцыпальнай палітыкі, яе прыярытэты і шляхі рэалізацыі [Гл.: 10, с. 261–262; 11, с. 33–35; 12, с. 86]. У гэтым сэнсе цалкам слушным уяўляецца рэзюме да вынікаў муніцыпальнай рэформы 1870-х гг., прадстаўленае аўтарамі абагульняйчай гісторыі Беларусі: "Гарады адміністрацыйных цэнтраў паступова сталі ператварацца ў цэнтры гаспадарчай дзейнасці" [9, с. 174], што закладвала падмурак для іх далейшага развіцця і мадэрнізацыі.

Прыняцце на урадавым узроўні новага Гарадавога палажэння 1892 г. па сутнасці застала муніцыпальным рэформы ў беларускіх губернях

у фазе іх разгортвання і практычгай рэалізацыі. Але гэтая “тэхналагічная нестыкоўка” цыклаў рэформ не стала адзінай праблемнай зонай. Істотныя карэктывы ўносіў у муніцыпальную сістэму сам змест і агульная накіраванасць Гарадавога палажэння 1892 г.

Замена існаваўшага з 1870 г. паняцця “городское общество” на “городское поселение” сутнасна рэдуцыравала трактоўку суб’екта самакіравання, зводзячы яго да статуса тэрытарыяльна-адміністрацыйнай адзінкі. Гэты падыход быў замацаваны ў артыкуле 7 Гарадавога палажэння 1892 г., дзе гарадское самакіраванне страціла зафіксіраваны ў папярэднім палажэнні 1870 г. статус “общественного”, а таксама – у артыкуле 137, які аднaзначна разглядаў муніцыпальныя органы ў якасці аднаго з “административных мест и лиц” у губернскай сістэме дзяржаўнай улады.

Усе гэтыя меры дапаўняў артыкул 22, які для тых гарадскіх пасяленняў, дзе было недастаткова гарадскіх сродкаў, паўаграрны характар занятасці насельніцтва і адносна невысокі ўзровень развіцця гандлю і промыслаў, прадугледжваў пераход на т. зв. “спрошчанае гарадское грамадскае кіраванне” [10].

Нарматыўнай дакументацыяй замест існаваўшых раней гарадскіх дум у гэтых цэнтрах уводзіліся сходы гарадскіх упаўнаважаных. Гэты выбарны калегіяльны орган па колькаснаму складу стаў на парадак меньшым у параўнанні з корпусам думскіх гласных 70-х – пачатку 90-х гг. XIX ст. і па закону не мог перавышаць максімум у 15 абраных дэпутатаў-упаўнаважных [11, арк. 3].

У гарадах мяжы пры неабходнасці “рэзервіраваць” у гарадскіх сходах адно–два месцы для асоб іудзейскага веравызнання, якія дапускаліся адміністрацыяй “да выканання абавязкаў гарадскіх гласных або ўпаўнаважаных”. Замест гарадскога галавы пры спрошчаным кіраванні ўводзілася пасада гарадскога старасты, які разам з адным ці двумя намеснікамі выбіраўся сходам упаўнаважаных і спалучаў выканаўчыя функцыі і абавязкі старшыні на пасяджэннях сходаў гарадскіх упаўнаважаных. Асноўныя паўнамоцтвы і сферы кампетэнцыі муніцыпальных органаў захоўваліся, але пры сістэме спрошчанага гарадскога кіравання яны пазбаўляліся права прымаць абавязковыя пастановы, самастойна складаць планы гарадоў у іх змены, весці нагляд за гандлем. Істотна ўзрастала падкантрольнасць выбарных муніцыпальных органаў губернскай адміністрацыі па важнейшым гаспадарчых і перад усім – па фінансава-бюджэтных пытаннях [4, с. 54–56].

У азначаным адміністрацыйна-прававым фармаце ішла з сярэдзіны 90-х гг. XIX ст. перабудова гарадскога самакіравання ў Мазыры

і Рэчыцы, якія ў складзе большасці (2/3) павятовых цэнтраў Беларусі былі пераведзены на сістэму спрошчанага гарадскога кіравання. Гомель і Рагачоў увайшлі ў групу губернскіх і павятовых цэнтраў, у якіх Гарадавое палажэнне 1892 г. уводзілася ў "поўным аб'ёме".

Новые органы самакіравання тым не меньш здолелі распрацаваць узгоднены курс муніцыпальнай палітыкі і наладзіць сталае і ў цэлым даволі эфектыўнае ўзаемадзеянне паміж спецыяльнымі (мэтавымі) камісіямі гарадскіх упаўнаважаных і апаратам выканаўчай улады горада.

Важнейшай задачай новага курса муніцыпальнай палітыкі стала упарадкаванне, стабілізацыя і пошук шляхоў далейшага развіцця гарадской фінансава-бюджэтнай сістэмы. Па звестках губернскага статыстычнага камітэта апошні значны дэфіцыт гарадскога бюджэту ў Рэчыцы зафіксаваны ў 1903 г. у перыяд згаданага муніцыпальнага крызісу на памежжы стагодзяў. Гэты дэфіцыт у 3 тысячы рублёў быў пакрыты за кошт гарадскіх рэзервных сродкаў (з запасного капіталу "на патрэбы горада"). У далейшым гарадскія бюджэты Рэчыцы выконваліся як бездэфіцытныя. Аналізуючы структуру гэтых бюджэтаў, варта адзначыць устойлівы рост іх даходнай часткі, што з'яўлялася вынікам пашырэння базы, а таксама – удасканалення метадаў фінансавага кантроля і фіскальнага інструментарыя. У першую чаргу муніцыпальныя ўлады здолелі забяспечыць стабільны рост паступлен-няў ад ацэначных збораў з дамоў і нерухомасці гараджан. Паводле фінансавых справаздач гарадскога самакіравання Рэчыцы ў 1910–1913 гг. Гэтыя сумы ў параўнанні з канцом 80-х гг. XIX ст., калі былі ўведзены ацэначныя зборы, выраслі больш чым у 10 разоў, у Гомелі – у 6 разоў. Пасля завяршэння пераацэнкі пляцавых і сядзібных участкаў (1905 г.) павялічыўся аб'ём выкупных сум, якія накіроўваліся ў запасны капітал "на патрэбы горада", працэнты з якога штогод паралічваліся ў даходныя часткі бюджэаў гарадоў. Ад пачатку XX ст. у Рэчыцы, Мазыры і Рагачове сталы характар набыла практыка рэгулянага афармлення спецыяльнымі арэндными дагаворамі здачы пад склады лесаматэрыялаў гарадскіх прыстаняў і прылягаўшай да іх тэрыторыі [12, с. 14–15]. Дастаткова стабільны, але адносна невялікі прырост даходнай часткі гарадскога бюджэту давалі асобныя аб'екты гарадской маёмасці (паромная пераправа на р. Днепр, гандлёвыя лаўкі на базарнай плошчы), а таксама спецыяльныя зборы з гарадскіх рамізнікаў, плата за гарадскія "рыбныя лоўлі" і інш.

Расходныя часткі гарадскіх бюджэтаў у адпаведнасці зартыкулам 138 Гарадавога палажэння 1892 г. былі зарыентаваны на першачарговае забеспячэнне "абавязковых расходаў", якія ў пераважнай большасці былі звязаны з утрыманнем і забеспячэннем мясцовага апарата паліцыі,

жандармерыі, турэмных устаноў і часткова-ваенных) у тым выпадку, калі яны размяшчаліся ў межах гарадской тэрыторыі.

Доля абавязковых расходаў у бюджэтах павятовых гарадоў пачатку XX ст. была надзвычай вялікай. Па нышых падліках у Рэчыцы яны забіралі ў 1902 г. каля 50 %, у 1908 г. – блізка да 40 % гарадскіх даходаў, а ў "рэкордным" 1910 г. абавязковыя расходы дасягнулі 19 тыс. 541 руб. Пры агульнай суме бюджэтных паступленняў у 23 тыс. 684 руб. [15, с. 146].

Аднак нават у такіх складаных фінансава-бюджэтных умовах гарадскія ўлады імкнуліся рэалізаваць галоўныя напрамкі муніцыпальнай палітыкі. Следам за Гомелем, дзе яшчэ ў 1880-я гг. у цэнтры горада быў пабудаваны новы гасцінны двор, а таксама абсталяваныя спецыялізаваныя гандлевыя плошчы-спадарожнікі (конны базар і інш.), з другой паловы 1890-х гг. у Рэчыцы і Мазыры аднаўляюцца работы па рэканструкцыі і далейшай забудове гандлёвых ліній на гарадскіх базарных плошчах. У 1911 г. гарадскія ўлады набываюць і ўстанаўліваюць тут высокаякасныя вялікія "соценныя" вагі, адначасова ўдасканальваюцца водазабеспячэнне і санітарна-гігіенічная інфраструктура цэнтральных базараў. З пачатку XX ст. у гарадском прамысловам комплексе Гомеля, Мазыря і Рэчыцы з'явіліся добра абсталяваныя бойні з навейшым тэхналагічным забеспячэннем.

Пачынаецца новы этап будаўніцтва і добраўпарадкавання гарадоў. З 1901 г. паслядоўна ўводзяцца дадатковыя лініі асвятлення гарадоў, а з 1903 г. у Гомелі, Рэчыцы, Мазыры былі ўведзены ў эксплуатацыю больш дасканалыя газава-калільныя ліхтары.

Важнай асаблівасцю гэтага часу з'яўляецца паварот да комплексных праграм развіцця гарадской структуры кантралюемых муніцыпальнымі органамі, якія ўключалі адасабленне прамысловых зон, рэгулярную забудову ўскраін з адначасовай мадэрнізацыяй культурна-прасторавага асяроддзя цэнтраў Мазыря, Рэчыцы і звязанных з ім месцаў адпачынку гараджан – гарадскіх бульвараў, набярэжных рэк, лодачных станцый, купален і інш. Бясспрэчным рэгіянальным лідарам у гэтай справе з'являўся Гомель, дзе пасля пріняцця новага генплана з другой паловы 1880-х гг. пачынаецца паэтапная рэалізацыя 9 пунктаў муніцыпальнай праграмы, прапанаванай гарадскім галавой С. І. Нолькеным. У выніку горад атрымаў значную сетку брукаваных маставых і тратуараў, упарадкаваныя скверы (сады) і зяленыя зоны. Гістарычный цэнтр горада атрымаў новыя культурна-спартыўныя аб'екты – летні і зімовы тэатры, музычныя пляцоўкі, трэк і інш. [13, с. 34–35].

Важным вектарам муніцыпальнай палітыкі павятовых цэнтраў рэгіёнаў з'ўлялася развіцце адукацыйна-асветніцкай сістэмы. Найбольш

дынамічнай у гэты час выглядала адукацыйная палітыка Рэчыцы якая пасля страты ў пачатку 1880-х гг. павятовага вучылішча, мела востры дэфіцыт у пачатковых і асабліва сярэдніх навучальных установах [5, с. 39].

З 1901 г. гарадскія актывісты на чале з інспектарам народных вучылішч Ф. В. Лукашэвічам зрабілі сапраўдны прарыў у развіцці пачатковай і сярэдняй адукацыі горада: была ўмацавана вучэбна-матэрыяльная база асноўных пачатковых школ і вучылішч [16, арк. 137–138; 17, арк 102–109].

Адначасова муніцыпальная ўлада прыняла двухгадовы план развіцця прафесійнай адукацыі ў горадзе і павеце з фінансаваннем ў аб’еме 65 тыс. рублеў. План адпачатку быў скаардынаваны з рэчыцкім павятовым земствам. Гарадскі сход Рэчыцы падтрымаў ініцыятыву педагагічнай грамадскасці па стварэнню ў горадзе настаўніцкай семінарыі, а ў снежні 1910 г. выступіў с хадайніцтвам перад міністэрствам народнай асветы аб адкрыцці ў горадзе мужчынскай гімназіі [18, арк. 21–21 зв.]. На жаль, рэалізацыі гэтых перспектыў перашкоділа сусветная вайна. Гарадскія ўлады Гомеля і Мазыра да пачатку XX ст. здолелі рэалізаваць галоўную задачу, якая была вызначана на працягу 1870–1880-х гг., у гэтых гарадах былі створаны поўныя мужчынскія і жаночыя гімназіі

Адначасова развівалася сістэма пачатковай і спецыяльнай адукацыі, усталяваліся трывалыя сувязі муніцыпальных органаў з прыватнымі гімназіямі і іншымі навучальнымі установамі [19, арк. 198–200 зв.]. Гэтыя здабыткі былі вынікам эфектыўнага выкарыстання практычных напрацовак і захадаў гарадскіх улад папярэдняга часу, а таксама – пераваг, якія давала малым і сярэднім гарадам праграма пераходу да новай адукацыйнай сістэмы.

На фоне выразна акрэсленай адукацыйнай дамінанты ў муніцыпальнай палітыцы павятовых гарадоў рэгіёну рэзкім кантрастам выглядае адставанне іншых асветніцкіх асяродкаў (публічных бібліятэк, музейных устаноў і г. д.). Існавалі праблемы ў развіцці устаноў аховы здароў’я, забеспячэння насельніцтва медыкаментамі, шераг невырашаных пытанняў у галіне камунальнай гаспадаркі. Вырашэнне гэтых задач гарадскія ўлады павятовых цэнтраў паўднева-усходняй Беларусі звязвалі з перспектывмі кардынальнага рэфармавання муніцыпальнай сістэмы Расійскай імперыі, якія актыўна абмярковаліся на шэрагу прадстаўнічых нарад па пытаннях гарадскога самакіравання і гаспадаркі ў 1910–1912 гг. [Гл.: 20, с. 20–26]. На жаль, целы блок канструктыўных прапаноў, выказаных на гэтых форумах, так і не быў рэалізаваны на практыце.

Спіс выкарыстанных крыніц і літаратуры

1 Атрушкевич, М. М. Городские реформы Российской империи 1870 г. / М. М. Атрушкевич // Пытанні гісторыі Беларусі: зборнік навуковых прац. – Мінск: БДУ імя Танка, 1998. – С. 52–61.

2 Грыбко, І. Л. Рэфармаванне гарадскога кіравання Беларусі у 70–80-я гг. XIX ст. / І. Л. Грыбко // Гістарычная навука ў Белдзяржуніверсітэце на рубяжы тысячагоддзяў. Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. 29 лістапада 1999 г. – Мінск: Выд. БДУ, 2000. – С. 91–95.

3 Грыбко, І. Выбары ў гарадскія думы ў Беларусі ў другой палове 70-х – пачатку 90-х гадоў XIX ст. / І Грыбко // Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – № 6. – С. 23 –27.

4 Юрочкин, М. А. Реформа городского самоуправления в Беларуси во второй половине XIX – начале XX вв. / М. А. Юрочкин. – Гомель: Белницэкология, 2002. – 152 с.

5 Аляксейчанка, Г. А. Муніцыпальная рэформа 1870–1880-х гг. у павятовых цэнтрах паўднева-усходняй Беларусі // Беларусь у XIX–XXI стагоддзях: праблемы этнакультурнага і нацыянальна-дзяржаўнага развіцця. – Зб. навуковых артыкулаў. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2013. – С. 35–41.

6 Терещенко, А. А. Формирование органов самоуправления в городах Центрального Черноземья в 70–90-е годы XIX века / А. А. Терещенко // Вопросы истории. – 2003. – № 9. – С. 118–125.

7 Моторова, Н. С. Участие органов самоуправления Беларуси в организации противопожарной охраны городов (1875–1914) / Н. С. Моторова // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы. Зб. навуковых артыкулаў : у 2 ч. Ч. 1. – Гомель: УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”, 2009. – С. 60–67.

8 Моторова, Н. С. Деятельность органов городского самоуправления по развитию системы средних учебных заведений (1875–1914 гг.) / Н. С. Моторова // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2011. – № 5. – С. 78–84.

9 Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII– пачатак XX ст.). – Мінск: Экаперспектыва, 2005. – 519 с.

10 Городовое положение 11 июня 1892 г. // ПСЗРИ. Собрание третье. – Т. XII. – № 8708. – С. 430–456.

11 Инструкция об организации городских упрощенных управлений 30 мая 1893 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд 299. – Воп. 1. – Спр. 78.

12 Аляксейчанка, Г. А. Рэчыца ў другой палове XIX ст.: муніцыпальнае самакіраванне і развіцце горада / Г. А. Аляксейчанка // Пятыя Міжнародныя Доўнарскія чытанні (Рэчыца, 22–23 верасня 2005 г.). – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2005. – С. 255–262.

13 Аляксейчанка, Г. А. Гомель у другой палове XIX – пачатку XX ст.: муніцыпальная палітыка і развіцце горада / Г. А. Аляксейчанка // Гомель:

старонкі гісторыі (да 870-годдзя першай сгадкі ў летапісе) : Зб. навуковых артыкулаў. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2012. – С. 31–37.

14 Аляксейчанка, Г. А. Муніцыпальная рэформа 1870–1880-х гг. і гарадское самакіраванне г. Мазыра / Г. А. Аляксейчанка // Мазыршчына: людзі, падзеі, час. Матэрыялы II Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. – Мазыр, 25–26 мая 2012 года. – Мазыр, 2012. – С. 82–86.

15 Аляксейчанка, Г. А. Гарадское самокіраванне, муніцыпальная палітыка і развіцце Рэчыцы ў канцы XIX–пачатку XX ст. / Г. А. Аляксейчанка // Шостыя Міжнародныя Доўнароўскія чытанні : у 2 ч. – Ч.2. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2008. – С. 142–148.

16 Журнал заседаний Речицкого городского собрания (1901 г.) // НГАБ. – Фонд 22. – Воп. 1. –Спр. 654.

17 Журнал заседаний Речицкого городского собрания (1908 г.) // НГАБ. – Фонд 22. – Воп. 1. – Спр. 998.

18 Журнал заседаний Речицкого городского собрания (1910 г.) // НГАБ. – Фонд 22. – Воп. 1. –Спр. 1041.

19 Журнал заседаний Мозырского городского управления (1908 г.) // НГАБ. – Фонд 22. – Воп. 1. –Спр. 996.

20 Совещание деятелей по городскому хозяйству в Санкт-Петербурге, 1–7 декабря 1912 г. – б/м, 1913. – 27 с.

Gennady Alyakseychanka. **Municipal reform of the 1890s in the county centers of Southeast Belarus.** *The article deals with questions related to the peculiarities of the municipal governance restructuring in the district center of southeastern Belarus as a result of the transition to the policemen palazhenne 1892 Particular attention is paid to the content of the organizational principles and the main focus of municipal policy and its focus on the development of cities.*

ЗВЕСТКІ АБ АЎТАРАХ

Аляксейчанка Генадзь Аляксандравіч	загадчык кафедры гісторыі славян і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Бабіна Алег Валер'евіч	загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Нацыянальнага ўніверсітэта караблебудавання імя адмірала Макарава (г. Нікалаеў, Украіна), кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Багданава Ганна Паўлаўна	аспірантка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, магістр гістарычных навук
Балахонаў Сяргей Аляксандравіч	настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі сярэдняй школы № 24 г. Гомеля
Барсук Алена Яўгеньеўна	дацэнт Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна, кандыдат гістарычных навук
Барташэвіч Андрэй Юр'евіч	выкладчык кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы), магістр гістарычных навук
Брыгадзін Дзяніс Пятровіч	начальнік аддзела міжнародных сувязяў Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
Высовень Аксана Іванаўна	дацэнт кафедры гісторыі і культуры Украіны Переяслаў-Хмяльніцкага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Г. Скаварады, кандидат гістарычных навук, дацэнт
Высоцкая Кацярына Ігараўна	аспірантка кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
Ганчар Уладзімір Алегавіч	дацэнт кафедры гісторыі славян і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, кандыдат гістарычных навук
Дуброўка Алена Мікалаеўна	дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, кандыдат гістарычных навук
Зубко Вольга Яўгеньеўна	спецыяліст аддзела міжнародных сувязей і дзейнасцей Вінніцкага нацыянальнага аграрнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук

Казімір Вера Анатольеўна	дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Інстытута гісторыі, этналогіі і правазнаўства імя Лазарэўскага Чарнігаўскага нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта імя Т. Г. Шаўчэнкі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Кандрацьеў Ігар Віктаравіч	дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Інстытута гісторыі, этналогіі і правазнаўства імя Лазарэўскага Чарнігаўскага нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта імя Т. Г. Шаўчэнкі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Кір'янава Алёна Леанідаўна	старшы выкладчык кафедры выдавецкай справы і рэдагавання Выдавецка-паліграфічнага інстытута Нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Ўкраіны "Кіеўскі палітэхнічны інстытут"
Кузьменка Юлія Уладзіміраўна	дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і міжнародных адносін Нежынскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Мікалая Гогаля, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Лайкоў Кірыл Міхайлавіч	малодшы навуковы супрацоўнік цэнтра гісторыі геапалітыкі Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі
Лебедзеў Андрэй Дзмітрыевіч	дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Лебедзева Юлія Аляксандраўна	старшы навуковы супрацоўнік аддзелу філасофіі і геапалітыкі Навукова-даследчага інстытута украіназнаўства Міністэрства асветы і навукі Украіны, кандыдат гістарычных навук
Маслоўскі Яўген Валер'евіч	аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
Маторава Надзея Сяргееўна	дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Панкоў Юрый Уладзіміравіч	малодшы навуковы супрацоўнік Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, магістр гістарычных навук
Пушкін Ігар Аляксандравіч	дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Райчонак Аляксандр Аляксандравіч	дацэнт Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Сідарава Святлана Алегаўна	аспірантка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, магістр гістарычных навук
Склярава Алена Міхайлаўна	навуковы супрацоўнік Навукова-даследчага інстытута ўкраіназнаўства
Талочка Дзмітрый Міхайлавіч	дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Тучынскі Віталь Анатольевіч	дацэнт Вінніцага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Кацюбінскага (г. Вінніца, Украіна), кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Улейчык Наталля Леанідаўна	дацэнт кафедры ўсеагульнай і славянскай гісторыі Гродненскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Хайнак Станіслаў Уладзіслававіч	магістрант кафедры ўсеагульнай гісторыі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны
Чаропка Станіслаў Аляксандравіч	загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Шыляеў Антон Паўлавіч	асістэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, магістр гістарычных навук
Ярашынскі Алег Багданавіч	вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гістарычнага навучання Навукова-даследчага інстытута ўкраіназнаўства Міністэрства асветы і навукі Украіны
Ярошова Эльвіра Барысаўна	прафесар кафедры гуманітарных дысцыплін Маскоўскага дзяржаўнага фінансава-юрыдычнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар

SUMMARY

Lebedeva Yuliya, Ph.D.

Geopolitical outline development of Ukrainian lands in the late XIII–XIV in the XVIII century. The article attempts to consider features of the Lithuanian expansion to Ukrainian lands at the end XIII–XIV century. It is proved that at the time the Grand principality of Lithuania was one of the largest state formations in Central and Eastern Europe. Proved that the Lithuanian state as a result of the conquest of large parts of Belarus and Ukraine, exhausted feudal system and the Horde attacks, was a union of separate land. Argued that during the Lithuanian enslavement Ukrainian statehood existed in the form of territorial authorities. 14

Anton Shyliayeu, M.A.

Hetman's power in the GDL's army in the end of 16th – beginning of the 17th century. In the present article deals with the powers of Hetman ON in the GDL's army after the military reforms of King Stefan Batory , and before coming to power Władysław IV. Emphasis is placed on the direct obligations of Hetman army management, as well as various judicial and economic powers and servants Hetman, who helped them in the performance of various duties. We consider the procedure for appointing the great hetman and dipole hetman and their interaction. 21

Uladzislau Khainak, M.A.

South vector of the foreign policy in the Polish-Lithuanian Commonwealth during the reign of Sigismund III Vasa. The article discusses foreign political activity of the Commonwealth to the south direction at the last quarter XVI – the first third of the XVII century was aimed at strengthening its political and economic influence in the Danube region. The foreign policy of the Commonwealth has the task of creating a buffer zone on the southern borders of the country from the Danubian principalities involved in the sphere of its interests. Active protection of the interests of the Commonwealth from the claims of the Ottoman Empire was the main character. 28

Навуковае выданне

ГІСТАРЫЧНЫЯ ШЛЯХІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА І СУСЕДЗЯЎ:

УЗАЕМАДЗЕЯННЕ І ЎЗАЕМАЎПЛЫВЫ

Зборнік навуковых артыкулаў

Падпісана да друку 06.09.2016. Фармат 60х84 1/8.
Папера афсетная. Рызаграфія. Умоўн. друк. арк. 7,4.
Улік.-выд. арк. 8,1. Тыраж 45 экз. Заказ 491.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вырабніка,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/87 ад 18.11.2013.
Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 02330 / 450 ад 18.12.2013.
Вул. Савецкая, 104, 246019, Гомель.